

**Штогод дзясяткі школ закрываюцца і столькі ж мяняюць свой «статус»: сярэднія становяцца базавымі, апошнія пераўтвараюцца ў дзіцячыя садкі—базавыя школы, а таксама ў дзіцячыя садкі—пачатковыя школы...** СТАР 2



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**



**Фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» — гэта знаёмства з багаццем рамёстваў, промыслаў, традыцый палескага краю, асноўнымі этапамі развіцця ўнікальнага рэгіёна Беларусі.** СТАР 8


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЖНІЎНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 163 (27278) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «БЕЛАРУСЬ У ЛОНДАНЕ БЫЛА ПРАДСТАЎЛЕНА НА САМЫМ ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ»

**Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і падзякаваў за гэта чэмпіёнам і прызёрам XXX летніх Алімпійскіх гульняў на сустрэчы ўчора ў Мінску.**



**Узнагарода — Аляксандры ГЕРАСІМЕНІ.**

«Заваяваныя ўзнагароды — гэта не проста дастойная ацэнка працы кожнага атлета, але і прадмет асаблівай гордасці нашай краіны. Вашы поспехі нас радавалі і натхнялі. Я шчыра ўдзячны вам за тое, што Беларусь у Лондане была прадстаўлена на самым высокім узроўні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, часам сумніўнага судзейства, прадузятага стаўлення з боку асобных міжнародных спартыўных чыноўнікаў вы, тым не менш, праявілі высокае прафесійнае майстэрства і, вядома ж, волю да перамогі», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў поспехі стралка Сяргея Мартынава, які атрымаў пераканаўчую перамогу над сапернікамі і ўстанавіў пры гэтым два новыя сусветныя рэкорды, а таксама Вікторыі Азаранка і Максіма Мірнага. «Гэта ацэнка ўзмацняецца тым, што яны змаглі перамагчы гаспадароў тэніснага корта Уімблдона. Гэта, вядома, дарагога каштуе!» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Цудоўнага поспеху дабілася Аляксандра Герасіменя! Да яе ў гісторыі суверэннай Беларусі ў плаванні ў нас яшчэ ніколі не было алімпійскіх узнагарод. Цяпер — адразу дзве сярэбраныя, — адзначыў Прэзідэнт. — Спадзяюся, што дасягненне Сашы паслужыць арыенцірам для астатніх, у тым ліку юных спартсменаў».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім атлетам, якія не шкадавалі сіл, ставілі перад сабой амбіцыйныя задачы і дабіваліся цудоўных вынікаў, а таксама трэнерскаму складу і многім іншым, хто прывёў спартсменаў да трыумфу. «Адзначу, што мы перажывалі за кожнага нашага спартсмена. Паколькі Алімпіяда — гэта асаблівыя спаборніцтвы, якія патрабуюць вялікай канцэнтрацыі і псіхалагічнай загартоўкі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым Прэзідэнт прызнаў, што некаторыя задачы, пастаўленыя перад беларускай камандай, засталіся нявыкананымі. «На жаль, не ўсе змаглі справіцца з напружаннем, настроіцца на перамогу ў жорсткім проціборстве сапернікам. Ну і што граху таіць, некаторыя наогул былі не гатовы выступаць на алімпійскіх спаборніцтвах», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў параўнанні з папярэднімі Алімпіядамі ў медальным заліку Беларусь апусцілася ўніз. Паводле яго слоў, у асобных відах спорту вынікі проста засмучальныя. Прэзідэнт паабяцаў, што гэта стане прадметам для асобнай сур'ёзнай размовы пасля дэталёвага аналізу вынікаў выступлення беларускіх алімпійцаў.

«Наперадзе нас чакаюць Алімпіяда ў Сочы і Рыа-дэ-Жанейра. Трэба знайсці мужнасць прызнаць дапушчаныя памылкі, улічыць набыты вопыт і настойліва, самааддана працаваць на вынік», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз падзякаваў чэмпіёнам і прызёрам Алімпіяды ў Лондане за высокае майстэрства і патрыятызм, якія былі прадэманстраваны ўсяму свету. «Няхай вашы перамогі нададуць пазітыўныя эмоцыі нашаму народу, а пачуццё гордасці за краіну, якая ўзгадавала вас, натхняе юных спартсменаў, вядзе іх да высокіх мэт і здзяйсненняў!» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў прызёрам Алімпійскіх гульняў, трэнерам дзяржаўныя ўзнагароды, прысвоіў ганаровыя званні, аб'явіў Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**БЕЛТА.**



## ВЯРХОЎСКАЯ КРЫНІЦА — ДОБРАЯ ВАДА

— Раней у нашай крыніцы было шырокае рэчышча, якое служыла вяскоўцам для ахаладжэння малака ўлетку, — кажа вярхоўская пенсіянерка Ніна Кучук. — Зручна было, і ўсім хапала месца. Паілі крынічнай вадою коней, прыганялі з фермы статак.

Цяпер нават свойскіх малочных рагуль у Вярхах не засталося, і халодная вада страціла ранейшае гаспадарчае прызначэнне. Але крыніца, як і раней, аб'ядноўвае жыхароў. Яны прыходзяць па ваду, збіраюцца на святы, калі прыязджае святар. І абавязкова сочаць за парадкам. Чатыры гады таму крыніцу добраўпарадкавалі ўдзельнікі брэсцкай моладзевай суполкі «Покліч», надалі ёй прыгожы выгляд, удала ўпісаўшы ў ландшафт. Святар з суседняй вёскі Расна ўрачыста асвяціў ваду, вяскоўцы прынеслі і павесілі над крыніцаю абразок.

— Разам мы наводзім парадак, каб кожнаму, хто прыязджае па ваду, прыемна было тут знаходзіцца, — кажуць у адзін голас Ніна Іванаўна і яе аднавяскоўкі Валянціна Барысавец і Валянціна Цырыбка *(на фotaздымку)*.

І гэтым разам жанчыны наведалі вярхоўскую святыню, каб прыбраць яе і ўпрыгожыць жнівеньскімі кветкамі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Камянецкі раён.*

## БЕСПРАЦОЎЕ НЕВЯЛІКАЕ...

**Сайт RABOTA.TUT.BY правёў апытанне сярод 698 рэспандэнтаў. У выніку высветлілася, што 84% апытаных зараз працуюць, аднак 64% з іх перыядычна праглядаюць новыя вакансіі.**

А 27% з гэтых работнікаў кожны дзень займаюцца пошукам новай працы. Галоўны фактар такіх паводзін, па меркаванні саміх апытаных, — нізкі заробак (44%). Толькі 4% задавальняе іх месца працы, а 8% хоць і не задаволены, але не шукаюць альтэрнатывы.

Пры ўсім гэтым беспрацоўе невялікае: сярод тых, у каго ёсць праблемы з працаўладкаваннем, толькі 12% шукаюць працу больш за паўгода, большасць — не больш за месяц. І многія вінавацяць у тым, што не могуць нічога знайсці, працадаўцаў, якія прапаноўваюць або маленькую заработную плату, або не патрэбныя вакансіі.

Аднак на думку большасці з іх, складанасць пры пошуку працы ў тым, што ім не хапае навыкаў, ведаў ці вопыту. Амаль ніхто з тых, хто шукае працу, не хоча зніжаць свае «зарплатныя» патрабаванні дзеля хуткага працаўладкавання.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Надвор'е

## НА ВЫХАДНЫЯ МОЦНЫЯ ЛІЎНІ І МЕСЦАМІ ГРАД

**У пятніцу наша краіна застанецца ў зоне павышанага атмасфернага ціску, таму будзе пераменная воблачнасць і пераважна без ападкаў, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Толькі ўвечары сёння месцамі ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях атмасферны фронт з боку паўднёвага захаду Еўропы выклікае кароткачасовы дождж і навальніцы. Тэмпература ўдзень ад 20 цяпла па поўначы да 28 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. А вось у суботу франтальны раздзел працягне рух далей на ўсход і пагоршыць надвор'е ўжо на ўсёй тэрыторыі краіны. Амаль паўсюдна будзе ісці дождж, месцамі моцныя ліўні і навальніцы, у асобных раёнах удзень магчымы нават град. Тэмпература паветра ў ноч на суботу 10—17, па паўднёвым захадзе да плюс 20; удзень — 22—28, на поўдні Гомельскай і Брэсцкай абласцей да 20 цяпла, а ў паўночных раёнах усяго 18—21 градус.

Дрэннае надвор'е будзе і ў нядзелю, калі пад уплывам вільготных няўстойлівых мас з боку Балтыйскага мора пройдуць невялікія дажджы, а ў асобных раёнах, пераважна па поўдні Беларусі, чакаюцца сур'ёзныя навальніцы і моцныя ліўні. У ноч на нядзелю будзе 10—17, удзень — 18—25 градусаў, а па поўдні краіны да 27 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у панядзелак паўднёвы цыклон прынясе нам яшчэ дажджы. Уначы чакаецца 13—20, удзень 17—24 цяпла, а па паўднёвым усходзе Гомельскай і Магілёўскай абласцей — да 25—30 градусаў. Прагназуецца, што ў аўторак пахаладае. Будзе зноў дажджліва. Удзень — толькі 15—22 цяпла. Няўжо хутка восень?

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ «Прамая лінія»

## ПРА ПЕНСІІ, І НЕ ТОЛЬКІ

Няма сумненняў, што пытанні, звязаныя з выплатай пенсій, адраснай сацыяльнай дапамогі з'яўляюцца актуальнымі для многіх мінчан. Таму ў чарговай «прамой тэлефоннай лініі» ў сценах рэдакцыі газеты «Звязда» прыме ўдзел **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна Аляксандраўна РАМАНОВІЧ.**

Такім чынам, увага! Задаць пытанні і выказаць свае пажаданні Жанне Аляксандраўне можна будзе ў сераду, **29 жніўня, з 10.00 да 12.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.**

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары **8 (017) 287 18 29.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта:**

***«Нягледзячы на ўсе намаганні, сітуацыя з дэмаграфічным крызісам у сталіцы ў цэлым не пераломленая, і трэба прадпрымаць канкрэтныя меры. У першую чаргу эканамічныя. Паглядзім, як мы можам пераразмеркаваць бюджэтныя сродкі. Можа быць, можна дзесьці менш грошай вылучыць на афарбоўку фасадаў, каб больш укласці ў гэтую сферу?»***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 23° |
| Віцебск | + 21° |
| Гомель | + 23° |
| Гродна | + 22° |
| Магілёў | + 22° |
| Мінск | + 23° |

### Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.08.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8320,00 | ▼ |
| Еўра | 10450,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 262,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1026,97 | ▼ |

## РАЗЫГРАНЫ РЭКОРДНЫ ДЛЯ БЕЛАРУСІ ДЖЭК-ПОТ

**Цяпер кампанія «Спорт-пары» актыўна шукае ўладальніка самага вялікага джэк-пота за ўсю гісторыю грашовых выйгрышаў у краіне. Удумайцеся толькі: яго сума складае 2 439 325 200 рублёў!**

Шчаслівая камбінацыя лічбаў, якая і вызначыла будучага мільярдэра, выпала 22 жніўня ў 404-м тыражы гульні «Спортлато 5 з 36» і вырашыла лёс 19-га па ліку джэк-пота. Да сумы амаль у 2,5 мільярда рублёў ён дарос за паўгода. Ужо вядома, што наваспечаны пераможца зрабіў аўтастаўку на 40 тысяч рублёў. Яшчэ ў кампаніі адзначылі, што гэты джэк-пот стане пятым па ліку, уладальнікам якога стане гулец, які зрабіў стаўку ў Брэсце.

Дарэчы, зусім нядаўна, 14 жніўня, 100 мільёнаў рублёў у «Кена» выйграў жыхар Салігорска, які зрабіў аўтастаўку на 4 тысячы рублёў у 934-м тыражы. Паводле яго слоў, гуляе ён не часта і пераможную стаўку зрабіў выпадкова, наўдачу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ГЕРМАНІІ ПЕРАВЯРНУЎСЯ АЎТОБУС, ТРАЎМІРАВАНА НЕ МЕНШ ЯК 30 ДЗЯЦЕЙ

Аўтобус з дзецьмі перавярнуўся на аўтабане на поўдні Германіі. Траўміравана па меншай меры 30 дзяцей. Як паведамляюць інфармагенцтвы, стан траіх пацярпелых медыкі ацэньваюць як цяжкі. Колькі ўсяго людзей было ў аўтобусе, пакуль не паведамляецца. Вядома толькі, што ў салоне, акрамя кіроўцы, былі яшчэ двое дарослых. ДТЗ адбылося недалёка ад горада Фрайзінг (Баварыя). Паводле папярэдняй інфармацыі, падчас моцнага дажджу вадзіцель не справіўся з кіраваннем і аўтобус з дзецьмі перакуліўся. У выратавальнай аперацыі былі задзейнічаны верталёты.

### УКРАІНЦЫ БОЛЬШ ЗА ЎСЁ ГАНАРАЦЦА ДЗЯРЖАЎНАЙ МОВАЙ, МЕНШ ЗА ЎСЁ ПАВАЖАЮЦЬ ГРЫЎНЮ

Дзяржаўная ўкраінская мова з'яўляецца найбольш шанаваным і паважаным атрыбутам незалежнай украінскай дзяржавы, сведчыць апытанне, праведзенае сацыялагічнай службай Цэнтра Разумкова сумесна з Фондам «Дэмакратычныя ініцыятывы» імя Ількі Кучэрыва.

Як паведамляе газета «Люстэрка тыдня. Украіна», 36% грамадзян заявілі, што дзяржаўнай мовай ганарацца. Яшчэ 55% засведчылі станоўчае да яе стаўленне. Усяго — 91%. Колькасць тых, хто адмоўна ставіцца да мовы, не змянілася — 5%; як і тых, хто хоча дзяржаўную мову змяніць на якую-небудзь іншую, — 3%.

Менш за ўсё грамадзяне ганарацца такім атрыбутам і сімвалам незалежнай дзяржавы, як яго грашовая адзінка — грыўня. Ганарацца грыўняй менш за чвэрць (23%) апытаных. З іншага боку, дзве трэці (67%) адносяцца да грыўні ўсё ж станоўча. Адмоўна — толькі 3%. Яшчэ 2% хацелі б грыўню змяніць на іншую валюту.

### НОВЫ СПІС САМЫХ УПЛЫВОВЫХ ЖАНЧЫН FORBES: МЕРКЕЛЬ ЗАХАВАЛА ЛІДАРСТВА



Традыцыйны штогадовы спіс ста самых уплывовых жанчын свету, складзены аўтарытэтным часопісам Forbes, як і ў мінулым годзе, зноў узначаліла канцлер Германіі Ангела Меркель. Дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан заняла другое месца. Трэцяй у рэйтынгу стала прэзідэнт Бразіліі Дылма Русеф. Канцлер ФРГ узначальвае рэйтынг самых уплывовых жанчын ужо ў шосты раз. У свой час яна захоўвала першае месца чатыры гады запар, аднак затым у 2010 годзе саступіла лідарства Мішэль Абаме. У гэтым рэйтынгу першая лэдзі ЗША займае толькі сёмы радок.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### КІТАЙ ВЫПРАБАВАЎ НАЙНОЎШУЮ МІЖКАНТЫНЕНТАЛЬНУЮ БАЛІСТЫЧНУЮ РАКЕТУ



Кітай правёў паспяховае выпрабаванне найноўшай міжкантынентальнай ракеты, здольнай дасягнуць любой кропкі на тэрыторыі ЗША, паведаміў у сваім апошнім нумары ўплывовы міжнародны штотыднёвы часопіс ISH Jane's Defence Weekly, які спецыялізуецца на ваеннай тэматыцы. Паводле наяўных даных, афіцыйна неаб'яўленае выпрабаванне «Дунфэн-41» (DF-41) было праведзена яшчэ ў мінулым месяцы. Ракета была запушчана з палігона «Учжай», размешчанага ў цэнтральнай кітайскай правінцыі Шаньсі, у напрамку пустыні на захадзе краіны.

Выданне Washington Free Beacon, якое спасылаецца на амерыканскія разведвальныя і ваенныя крыніцы, паведамляе, што выпрабаванне МБР было праведзена 24 ліпеня.

DF-41 з'яўляецца мабільным комплексам, вельмі падобным па вонкавым выглядзе на расійскі «Тополь». Аднак, мяркуючы па фатаграфіі комплексу, апублікаваным яшчэ ў 2007 годзе, большы за яго.

Дальнасць дзеяння ракеты, паводле інфармацыі ISH Jane's Defence Weekly, складае ад 10 тыс. да 14 тыс. км.

КОРАТКА

Налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені—ліпені гэтага года склала Br3 млн 358,3 тыс. У ліпені сярэдняя зарплата работнікаў дасягнула Br3 млн 925,9 тыс., яна павялічылася ў параўнанні з чэрвенем гэтага года на 4,6 працэнта, або на Br173,8 тыс.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі вядзецца актыўная работа па забеспячэнні кабінетаў неабходным абсталяваннем і сродкамі навучання. Для аптымізацыі сродкаў Міністэрства адукацыі прыняло рашэнне аб цэнтралізаванай пастаўцы з 2013 года абсталявання для кабінетаў фізікі, хіміі, біялогіі.

Паводле аператыўнай інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання на 23 жніўня, валавы збор збожжа ў сельскагаспадарчых арганізацыях краіны склаў больш за 8,46 млн.т. У мінулым годзе на гэтую дату было сабрана 7,44 млн.т збожжавых.

## ШТО ВЫ ДУМАЕЦЕ ПРА БЕЛАРУСЬ?

*(Пытанне для латышоў, якія наведалі нашу краіну)*



**Ліенэ АЗАЛІНА, г. Рыга, студэнтка Латвійскага дзяржаўнага ўніверсітэта, факультэт гісторыі і філасофіі, спецыяльнасць «Культурная спадчына»:**

— Я бачыла толькі Мінск, Навагрудак і Любчу— усё вельмі цікава. Ёсць некаторыя элементы таго, як у Латвіі было ў савецкія часы. Некаторыя ж рэчы вельмі сучасныя.

Ды і cultural landscape — культурны пейзаж — зусім іншыя. Напрыклад, грамадская лазня — у нас такога ўжо даўно няма.

І песні каля вогнішча па вечарах — гэта тое, што мы згубілі пасля распаду Саюза. Збор каля вогнішча, летнікі — усё гэта лічыцца ў нас перажыткам мінулых часоў. А ў Беларусі мне давялося з кампаніяй моладзі трапіць на прыроду, пажыць у намётах, паспяваць увечары пад гітару — я атрымала вялізную асалоду.



**Сяргей АРЛОЎ, г. Рыга, акцёр, супрацоўнік букмекерскай канторы:**

— Неяк летам я наведваў ваш Нясвіж. Цікава было паглядзець на палац, у якім жылі князі, на вялікі парк, на возера — на тое, з якім размахам гэта ўсё зроблена. Асаблівая атмасфера і шыкоўнасць уразілі. Гэта нагадала мне, як неяк у Шатландыі мяне на кабрыялеце падвозіла адна арыстакратка. За рулём сядзела вылітая Сафі Ларэн — на англійскі манер. У лёгкай сукенцы, гадоў 50-55, але настолькі прыемная дама, голас такі лёгкі, мяккі — я амаль закахаўся. А ў Нясвіжы я спрабаваў уявіць, як бы мне жылося на месцы былых уладальнікаў замка...

Пасля паездкі ў Беларусь мне хочацца неяк змяніць сваё жыццё ў Латвіі, пераасэнсаваць, расставіць новыя акцэнты.



**Вольга РАЗУМЕЙКА, г. Рыга, выпускніца Інстытута транспарту і сувязяў, спецыяльнасць «Лагістыка»:**

— Цалкам разбурыўся мой стэрэатып пра тое, якая Беларусь здалёк бачылася — постсавецкая прастора, «кавалак» некранутага СССР. А прыехалі ў Мінск і зразумелі, што гэта не «кавалак», а аазіс СССР. Ёсць шмат чаго добрага савецкага, што мы згубілі. І ёсць многа еўрапейскага, таксама станоўчага.

Чаго не хапае ў еўрапейскіх краінах — вось гэтага адчування моцнай рукі. Там ёсць шмат людзей, якім няма да цябе справы: збіраецца парламент і прымае рашэнні. Не хапае адчування, што ёсць нехта, хто адказны за ўсё. Дзесьці, можа, гэта і суперкантроль, але, з іншага боку, адчуваеш, што ты не застаешся сам-насам са сваімі праблемамі.

Культура моцна здзівіла. Тут я ўбачыла шмат вясёлых маладых людзей, якія ведаюць і любяць сваю мову, вельмі цікавяцца гісторыяй. І ваша мова мяне прыемна ўразіла — аказваецца, яна вельмі мілагучная.

**Падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ ВА УРАДЗЕ

# САЎМІН ЗАЦВЕРДЗІЎ ПАЛАЖЭННЕ АБ ПЕРАДАЧЫ НЕПАЎНАЛЕТНІХ У КАМЕНДАНЦКІ ЧАС

**У Беларусі зацверджана Палажэнне аб парадку перадачы непаўналетніх (ва ўзросце да 16 гадоў), якіх супрацоўнікі органаў унутраных спраў у перыяд з 23.00 да 6.00 сустрэлі на вуліцы без суправаджэння бацькоў, апекуноў або папячыцеляў ці без суправаджэння па іх даручэнні паўналетніх асоб, бацькам, апекунам ці папячыцелям або па іх даручэнні паўналетнім асобам і дастаўлення такіх непаўналетніх у сацыяльна-педагагічныя цэнтры. Дакумент зацверджаны пастановай Саўміна № 772 ад 22 жніўня, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Пастанова ўступіць у сілу з 5 верасня гэтага года.

Гэта палажэнне складаецца з трох раздзелаў. У прыватнасці, у ім гаворыцца, што калі міліцыя сустракае непаўналетняга з 23.00 да 6.00 па-за жыллём і без суправаджэння дарослых (бацькоў, апекуноў і г.д.), то на працягу трох гадзін дзіця трэба перадаць законнаму прадстаўніку або паўналетняй асобе. Калі за гэты час перадаць непаўналетняга не ўдалося (напрыклад, немагчыма знайсці бацькоў), то яго дастаўляюць у сацыяльна-педагагічны цэнтр. Таксама ў дакуменце адзначаецца, што дзеянне палажэння не распаўсюджваецца на непаўналетніх, якія ў выключных выпадках надзелены дзеяздольнасцю ў поўным аб'ёме (у выпадку заключэння шлюбу, нараджэння дзяцей і г.д.).

У палажэнні гаворыцца, што супрацоўнікі органаў унутраных спраў павінны высветліць прозвішча, імя і імя па бацьку дзіцяці, дату нараджэння і іншыя даныя, неабходныя для ўстанаўлення месцазнаходжання законных прадстаўнікоў. Пры неабходнасці яны дастаўляюць непаўналетняга ў тэрытарыяльны орган унутраных спраў. Пасля ўстанаўлення асобы міліцыянеры павінны неадкладна прыняць меры па інфармаванні законных прадстаўнікоў аб месцазнаходжанні дзіцяці.

Акрамя таго, дакумент забараняе перадаваць непаўналетняга законным прадстаўнікам або паўналетнім асобам, якія не маюць пры сабе дакументаў, што засведчваюць іх асобу, або знаходзяцца ў стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення, псіхічна хворым і г.д. Пры гэтым пры перадачы непаўналетняга даросламу складаецца акт аб перадачы непаўналетняга ў трох экзэмплярах. Першы экзэмпляр перадаецца таму, хто прымае дзіця, другі застаецца ў органе ўнутраных спраў, а трэці на працягу трох рабочых дзён накіроўваецца ў раённую або гарадскую камісію па справах непаўналетніх.

Што датычыцца выпадкаў, калі міліцыя вымушана даставіць непаўналетняга ў сацыяльна-педагагічны цэнтр, то для гэтага забараняецца выкарыстоўваць матацыклы, мапеды, іншыя транспартныя сродкі, не прызначаныя для перавозкі людзей. Таксама супрацоўнік органаў унутраных спраў абавязаны прыняць меры, якія выключаюць прычыненне шкоды здароўю непаўналетняга, забяспечваюць захаванасць рэчаў дзіцяці, дакументаў і каштоўнасцяў.

Акрамя таго, у дакуменце сказана: «У мэтах асабістай бяспекі непаўналетняга супрацоўнік прапануе яму перад пасадкай у транспартны сродак прад'явіць колькасць яго асабістых рэчаў». Таксама ў час дастаўлення непаўналетняга ў сацыяльна-педагагічны цэнтр міліцыянер абавязаны пастаянна назіраць за паводзінамі дзіцяці і станам здароўя. Калі ў непаўналетняга з'явіліся прыкметы рэзкага пагаршэння стану здароўя, міліцыянер абавязаны неадкладна выклікаць брыгаду хуткай медыцынскай дапамогі або даставіць дзіця ў бліжэйшую дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя. Больш таго, да прыбыцця хуткай дапамогі супрацоўнік прымае неадкладныя меры па аказанні неабходнай дапамогі

■



# ПЕРАДВЫБАРНАЯ АГІТАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ СТАРТАВАЛА Ў БЕЛАРУСІ

СТАРТАВАЛА передвыбарная агітацыя кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання, паведаміў **сакратар Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай ЛАЗАВІК.**

Паводле слоў сакратара ЦВК, ёсць кандыдаты ў дэпутаты, якія атрымалі пасведчанні аб рэгістрацыі ўжо ўчора, хоць, згодна з каляндарным планам падрыхтоўкі і правядзення выбараў у ніжнюю палату парламента, акруговыя выбарчыя камісіі могуць выдаваць іх у двухдзённы пасля рэгістрацыі тэрмін.

«Кандыдаты ў дэпутаты, якія маюць на руках пасведчанні, маглі пачынаць агітаваць за сябе літаральна на выхадзе з будынка, дзе праходзіла пасяджэнне акруговай камісіі», — сказаў Мікалай Лазавік.

Выступаць з перадвыбарнымі праграмамі па дзяржаўным радыё і тэлебачанні прэтэндэнты на месца ў парламенце пачнуць 27 жніўня. У дзень рэгістрацыі для кожнага з іх шляхам жараб'ёўкі вызначылі дату і час выступленняў.

Сакратар Цэнтрвыбаркама нагадаў, што перадвыбарныя выступленні, як і ўдзел у тэле- і радыёдэбатах, — справа добраахвотная. «Калі які-небудзь кандыдат лічыць, што іншыя спосабы агітацыі, асабістыя сустрэчы, напрыклад, больш эфектыўныя, палічыць за лепшае выкарыстоўваць больш магчымасцяў для непасрэдных размоў з выбаршчыкамі, то гэта яго права», — падкрэсліў Мікалай Лазавік.

Акрамя выступленняў у тэле- і радыёэфіры кандыдат у дэпутаты мае права апублікаваць сваю перадвыбарную праграму ў адной з рэспубліканскіх газет — «Звяздзе», «Народной газете», «Рэспубліцы», «Белорусской ниве». Прэтэндэнт на дэпутацкае крэсла можа выбраць адпаведную абласную газету, або раённыя, гарадскія газеты, якія выдаюцца на тэрыторыі выбарчай акругі і з'яўляюцца дзяржаўнымі, ці часткова фінансуюцца з рэспубліканскага або мясцовага бюджэту, або адным з заснавальнікаў якіх выступаюць дзяржаўныя органы ці арганізацыі.

Тэкст перадвыбарнай праграмы, падпісаны кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, павінен быць прадстаўлены ў рэдакцыю газеты не пазней за 2 верасня 2012 года на папяровым і электронным носьбітах. Пры апублікаванні перадвыбарных праграм захоўваецца чарговасць іх паступлення, якая вызначаецца на падставе асобнай рэгістрацыі ў рэдакцыях газет з пазначэннем даты і часу паступлення кожнай праграмы.

Перадвыбарная агітацыя ў Беларусі прадоўжыцца да 22 верасня ўключна. Асноўны дзень галасавання на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў назначаны на 23 верасня.

Мікалай Лазавік таксама выказаў меркаванне, што для наглядальнікаў за выбарамі ў Беларусі заўсёды ствараюцца самыя спрыяльныя ўмовы.

Гаворачы пра ўмовы для міжнародных наглядальнікаў, сакратар ЦВК падкрэсліў, што ніводная замежная місія ніколі не мела падстаў, каб зрабіць хоць якую-небудзь заўвагу наконт умоў работы ў Беларусі. «Наглядальнікі могуць свабодна, без папярэджання наведваць любыя рэгіёны, сустракацца з членамі выбарчых камісій, прадстаўнікамі партый і грамадскіх аб'яднанняў, мясцовых улад і іншых дзяржаўных органаў», — адзначыў Мікалай Лазавік.

На гэты час Цэнтрвыбаркам акрэдытаваў 157 міжнародных наглядальнікаў: 48 ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ, тры ад Цэнтральнай выбарчай камісіі Расіі, аднаго ад Цэнтральнай выбарчай камісіі Малдовы. Акрамя таго, ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў акрэдытаваны 105 наглядальнікаў, у тым ліку сямёра экспертаў ад Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД.

**БЕЛТА.**

■ Здарэнні

## МАЁМАСЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВА — НА ЎЛАСНЫЯ ПАТРЭБЫ

**Упраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці спынена карупцыйная дзейнасць кіраўніка аднаго з вытворчых падраздзяленняў ААТ «Гроднажылбуд», які працяглы час прысвойваў маёмасць прадпрыемства, выкарыстоўваючы службовыя паўнамоцтвы. Заведзена крымінальная справа.**

У выніку аператыўна-следчых дзеянняў яшчэ адным падазроным стаў блізкі сваяк гэтага кіраўніка (таксама службовая асоба ААТ «Гроднажылбуд»), які пры будаўніцтве ўласнага дома выкарыстоўваў украдзеную маёмасць прадпрыемства. Устаноўлена, што крадзеж будаўнічых матэрыялаў ажыццяўляўся па дамоўленасці з іншымі службовымі асобамі акцыянернага таварыства. Вынікам падобных дзеянняў стала істотнае падаражэнне будаўніча-мантажных работ, якія выконваюцца гэтым прадпрыемствам, паколькі прысвоеныя матэрыяльныя каштоўнасці спісваліся пад выглядам выкарыстання на аб'ектах афіцыйнага будаўніцтва, паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ЧЭКІСТЫ ЛІКВІДАВАЛІ КАНАЛ ТРАНЗІТУ НАРКОТЫКАЎ

**Супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Віцебскай вобласці спынілі дзейнасць транзітнага канала пастаўкі наркатычных сродкаў праз Рэспубліку Беларусь у краіны Еўрасаюза.**

— Супрацоўнікамі ўпраўлення была атрымана інфармацыя аб кантрабандзе наркотыку праз Віцебск — для далейшай рэалізацыі ў краінах Еўрапейскага саюза. У выніку правядзення аператыўна-вышуковых дзеянняў быў устаноўлены атрымальнік грузу і выяўлена месца перадачы наркатычных сродкаў, — паведамляюць у прэс-групе УКДБ па Віцебскай вобласці. — У момант здзяйснення здзелкі затрыманы двое 23-гадовых жыхароў Віцебска, у якіх канфіскавана 300 грамаў гашышу. Яшчэ каля 800 грамаў наркотыкаў канфіскавана па месцы жыхарства затрыманых.

Следствам устаноўлена роля кожнага арганізатара транзітнага канала. Адзін з маладых мужчын дастаўляў наркотыкі ў Віцебск, а другі перапраўляў іх у краіны Еўрасаюза. У дачыненні да затрыманых УКДБ па Віцебскай вобласці распачата крымінальная справа. Згодна з адпаведным артыкулам Крымінальнага кодэкса, яны могуць быць пазбаўлены волі тэрмінам да 13 гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

## АБЗАЦ

◢ У 2013 годзе ў Мінску пройдзе XV Міжнародны з'езд славістаў. Чакаецца, што ў ім прымуць удзел каля тысячы даследчыкаў з 40 краін. Пытанні падрыхтоўкі з'езда будуць абмяркоўвацца 27-28 жніўня ў НАН Беларусі. Міжнародныя з'езды славістаў праводзяцца з 1929 г. раз на пяць гадоў у розных краінах.

◢ **За першае паўгоддзе ў Мінскай вобласці зарэгістравана 4 тыс. 62 шлюбы і 2 тыс. 988 разводаў. У рэгіёне суадносіны колькасці разводаў да колькасці шлюбаў склалі 73%, а ў Дзяржынскім, Крупскім, Пухавіцкім, Салігорскім і Старадарожскім раёнах — больш за 80%.**

◢ У Кастрычніцкі РАУС г. Гродна звярнуўся 32-гадовы жыхар абласнога цэнтра і паведаміў аб знікненні з яго кватэры польскіх злотых у эквіваленце амаль $200 тыс. Сярод падазраваных разглядаўся ў першую чаргу прыяцель гаспадара кватэры, якому ён даверыў ключы пасля наведвання забаўляльнай установы, а таксама 29-гадовы прараб, які будаваў пацярпеламу дачу. Аднак злодзеем аказаўся брат-блізнюк прараба. Ён непрыкметна зрабіў копію ключоў ад 4-пакаёвай кватэры і ў зручны момант наведаў яе. Грошы знайшлі на гарышчы дома ў Брэсцкай вобласці — на малой радзіме зламысніка. Пайсці на крадзеж яго прымусіла захапленне азартнымі гульнямі. Напярэдадні ён прайграў у покер буйную суму.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ



◢ **Кур'ёзны выпадак адбыўся на днях у Аўстрыі. Пародзістага ката мэйн-куна па мянушцы Купідон коштам 3000 фунтаў стэрлінгаў укралі з дому ў гарадку Ландскрон. Гаспадыня неадкладна звярнулася ў паліцыю, і там, па меры магчымасці, пачалі яго шукаць. Але аказалася, што дапамога паліцыі не спатрэбілася. Справа ў тым, што Купідон быў даволі буйным прадстаўніком сваёй пароды. Відаць, гэта і адыграла вызначальную ролю ў тым, што праз два тыдні зладзеі вырашылі вярнуць украдзеную жывёлку: яны зразумелі, што не змогуць пракарміць ката. Купідона падкінулі ў гасцёўню дома ў той час, калі гаспадыня выносіла смецце.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*


## КОНКУРСНОЕ ПРИГЛАШЕНИЕ

**Республиканское унитарное производственное предприятие «Экзон-Глюкоза» объявляет ОТКРЫТЫЙ КОНКУРС на закупку зерна кукурузы урожая 2012 года.**

**Источник финансирования:** собственные средства.

**Срок поставки:** согласно задания на закупку.

**Торги будут проведены 24.09.2012 года в 11.00 по адресу:** г. Дрогичин, ул. Ленина, 204.

**Основные характеристики заказа:** кукурузное зерно ТУ BY 290215113.007-2010, ГОСТ 13634-90, ДСТУ 4525:2006.

**Конкурсную документацию можно получить бесплатно по адресу:** г. Дрогичин, ул. Ленина, 204 с 8.00 до 17.00 или по эл. адресу Ekzon-glukoza@mail.ru.

**Конкурсные предложения принимаются на русском языке в запечатанных конвертах по адресу:** г. Дрогичин, ул. Ленина, 204 с 8.00 до 10.00 до 24.09.2012 года.

С победителем торгов будет заключен договор (контракт) поставки.

В случае Вашего согласия участвовать в торгах просим Вас сообщить об этом по адресу: 225612, г. Дрогичин, ул. Ленина, 204 или по т/ф (01644) 3 63 93.

*УНП 290215113.*

**Уважаемые акционеры Открытого акционерного общества «Столичный проспект»!**

30 августа 2012 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Столичный проспект» (Брестская обл., г. Жабинка, ул. Титова, 3).

**Повестка дня собрания:**

1) Об увеличении Уставного фонда ОАО «Столичный проспект» за счет собственных средств путем увеличения номинальной стоимости каждой акции.

2) Об утверждении изменений в Устав Общества.

Основание проведения собрания – Решение Наблюдательного совета Общества (Протокол № 5 от 17 августа 2012 года).

Дата, на которую составлен реестр акционеров и явочный лист участников собрания, – 01 августа 2012 года.

Форма проведения собрания – очная.

Форма голосования – бюллетенями.

Место проведения собрания: г. Жабинка, клуб ОАО «Жабинковский сахарный завод».

Время начала проведения собрания: 12.30.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повести дня собрания: в рабочие дни с 23 по 29 августа 2012 г. с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Титова, 3.

Обращаем ваше внимание, что для участия в собрании необходимо иметь при себе документы, удостоверяющие личность, а представителям юридических лиц – надлежаще оформленные доверенности. *УНП 290984478*


■ Сем разоў адмерац

# ШКОЛЫ БУДУЦЬ ЗАПАТРАБАВАНЫ калі павялічыцца нараджальнасць

**Для Віцебшчыны праблема №1 у сістэме адукацыі — малакамплектныя школы. Штогод 20-25 школ закрываюцца і столькі ж мяняюць свой «статус»: сярэднія становяцца базавымі, апошнія пераўтвараюцца ў дзіцячыя садкі—базавыя школы, а таксама ў дзіцячыя садкі—пачатковыя школы... А што рабіць з настаўнікамі, якія ў выніку закрыцця школ могуць застацца без працы? Ці магчыма добра наладзіць падвоз дзяцей у іншыя школы? А можа, лепш зрабіць так, каб дзеці жылі там, дзе вучацца?**

— Сёлета з мэтай аптымізацыі школьнай сеткі ў сувязі са змяншэннем колькасці навучэнцаў да 1 верасня закрыты 18 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку 3 пачатковыя школы, столькі ж дзіцячых садкоў—пачатковых школ, 11 базавых і сярэдняя школа. Аптымізаваны 19 устаноў адукацыі, у тым ліку сярэднія ў базавыя — 2, базавая ў сярэднюю — адна, і гэтак далей, — расказвае Іван Шчурок, начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама. — Да рэструктурызацыі, якая адбываецца ў сістэме адукацыі вобласці, падыходзім вельмі прадумана. Мы не спяшаемся закрываць школы. А трэба. Асаблівасць Віцебскай вобласці ў тым, што тут каля 6,5 тысячы населеных пунктаў. Для параўнання, у Мінскай вобласці — 4,5 тысячы. І, зразумела, столькі школ, як калісьці, сёння не патрэбны. А прыняць рашэнне аб закрыцці ўсіх малакамплектных школ — гэта няправільна. Такія захады выклікаюць незадаволенасць людзей.

Каб закрыць школу, колькі вучняў у ёй павінна вучыцца? Аказваецца, такога канкрэтнага паказчыка няма. Вучняў павінна быць прыкладна дваццаць чалавек. Напрыклад, у вёсцы Труды Полацкага раёна ў базавую школу хадзілі толькі 17 чалавек. Хацелі закрыць школу, але бацькі і настаўнікі папрасілі гэтага не рабіць — пісалі лісты, тэлефанавалі. І так доўжылася гады тры. Добрая школа — цагляны будынак у тры паверхі. Шкада закрываць, а з іншага боку, вялікія выдаткі патрабуюцца на ўтрыманне. Сёлета прынялі рашэнне: закрыць. Вырашылі пытанне па падвозе дзяцей у іншую школу. А што рабіць з будынкам?

— Лічу, калі не прадаваць, дык кансерваваць трэба такія будынкі: «зашываць» вокны і кантраляваць, як будынак захоўваецца. Але працэс можа быць зваротным. Школы будуць запатрабаваны, калі павялічыцца нараджальнасць, — працягвае начальнік упраўлення. — Што да школы ў Трудах, пытанне па падвозе дзяцей мы вырашылі — максімум на 20 кіламетраў... Будаўніцтва новых школ, на мой погляд, павінна весціся ў буйных населеных пунктах, гарадах. У Наваполацку на беразе Заходняй Дзвіны, бліжэй да Полацка, будуецца першая пачатковая школа—дзіцячы садок, разлічаная на 480 школьнікаў, бо там шмат маладых сем'яў... Будаўніцтва павінна ў перспектыве весціся і ў мікрараёнах старой забудовы. Напрыклад, на вуліцы Ленінградская ў Віцебску. І там з часам трэба будзе пабудаваць установу адукацыі.

Каб вырашыць пытанне з падвозам, як расказаў Іван Шчурок, запрасілі ўсю інфармацыю па раёнах: дзе існуюць праблемы з гэтым? У асобных раёнах праведзены капітальныя рамонты аўтобусаў. Установы адукацыі сёлета павінны атрымаць 21 новы аўтобус. Увогуле будуць падвозіць дзяцей 195 аўтобусаў. Такім чынам, праблема пакуль што практычна вырашаецца. Але і надалей школы будуць закрывацца...

**Каб закрыць школу, колькі вучняў у ёй павінна вучыцца? Аказваецца, такога канкрэтнага паказчыка няма.**

Ёсць пытанне з падвозам аўтобусамі аўтапрадпрыемстваў. У асобных раёнах скарацілі маршруты, і гэта, безумоўна, выклікае заклапочанасць. Праблема ўзнікае і там, дзе прыгарадны аўтобус, напрыклад, раней курсіраваў пяць разоў на тыдзень, а потым яго рух быў скарочаны толькі да двух дзён. У такіх выпадках раённы аддзел адукацыі дапамагае сваім транспартам.

Пры гэтым, паводле інфармацыі на канец мінулага навучальнага года, не падвозіліся ні школьнымі аўтобусамі, ні рэйсавымі каля дзесяці вучняў.

❍ ❍ ❍

У савецкія гады ў прышкольных інтэрнатах дзеці жылі ў элементарных бытавых умовах: пліта, халадзільнік. Ніхто да месца вучобы іх не падвозіў. Вядома, каб працаваў такі інтэрнат, пры школе неабходна наладзіць арганізаванае пражыванне, харчаванне, прадугледзець у штаце калектыву наяўнасць не толькі педагогаў, але і выхавацеляў. Усе клопаты былі на плячах дырэктараў школ. І ў наш час такія прышкольныя інтэрнаты дзейнічаюць.

Што выгадней: падвозіць дзяцей да месца вучобы ці ствараць інтэрнаты пры школах? На думку кіраўніцтва ўпраўлення адукацыі, у гэтым пытанні патрэбны індывідуальны падыход. Па-першае, трэба атрымаць згоду бацькоў, па-другое, павінна быць падрыхтавана база. Вядома, лепш за ўсё дзіцяці дома. Але... Пакуль ёсць падвоз да школы на адлегласці 10-15 кіламетраў, інтэрнат не патрэбны, а калі будзе, напрыклад, 50 і больш кіламетраў, можа ўзнікнуць патрэба ў інтэрнатах.

У свой час адышлі ад інтэрнатаў таму, што бацькі павінны былі аплачваць харчаванне дзяцей. Зараз за кошт дзяржавы можна арганізаваць 4-разовае харчаванне. У Браславе, напрыклад, пры СШ № 2 дзейнічае інтэрнат. Увогуле ж, ён адкрываецца пры школе, калі ёсць не менш за 15 дзяцей, бацькі якіх далі згоду на пражыванне па-за сценамі дома. У аграгарадку Опса Браслаўскага раёна пакуль інтэрнат не працуе, але будынак ёсць. І пасля закрыцця чарговых школ ён можа спатрэбіцца — і гэтае пытанне на кантролі. У Шумілінскім раёне ў населеным пункце Лескавічы інтэрнат працуе. Практычна пры ўсіх гімназіях ёсць інтэрнаты: у Полацку, Паставах, Верхнядзвінску, Бешанковічах...

Вядома, у такіх інтэрнатах могуць працаваць настаўнікі, якія пазбавіліся месца работы з-за закрыцця школ. Як і ў дамах сямейнага тыпу. Сёлета, напрыканцы года, павінны быць здадзены «пад ключ» два такія дамы — у гарадскім пасёлку Відзы Браслаўскага раёна і ў вёсцы Арэхаўна Ушацкага раёна.

Работы для тых, хто хоча выхоўваць чужых дзяцей, на жаль, шмат. Чаму «на жаль»? Толькі за першыя сем месяцаў гэтага года ўжо з'явілася каля 240 дзяцей, бацькоў якіх пазбавілі правоў на выхаванне. Для параўнання, гадоў пяць таму колькасць такіх дзяцей дасягала 700 чалавек. На паніжэнне статыстыкі, безумоўна, уплывае і дзеянне прэзідэнцкага Дэкрэта № 18, які быў прыняты для абароны інтарэсаў дзяцей. Амаль 70 працэнтаў дзяцей, бацькі якіх пазбаўлены правоў на выхаванне, жывуць у сем'ях.

Але паралельна ўзнікла і праблема з-за закрыцця інтэрнатаў. За апошнія шэсць гадоў закрылі дзевяць школ-інтэрнатаў: у Бешанковічах, Верхнядзвінску і гэтак далей. На іх плошчах адкрылі новыя навучальныя ўстановы. Плануецца закрываць і іншыя інтэрнаты, бо яны ўжо ў хуткім часе не будуць запатрабаваны. Якім чынам вырашыць кадравыя пытанні і як выкарыстоўваць будынкі — гэта праблемы, якія застаюцца актуальнымі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

■ Інфарм-укол

# ШТО ДЗЯЦЕЙ ДАВОДЗІЦЬ ДА НЕЎРОЗУ?

**Дзеці могуць пакутаваць ад неўратычных расстройстваў — захворванняў, у аснове якіх ляжаць часовыя парушэнні нервовай сістэмы. Узнікаюць гэтыя парушэнні пад уплывам нейкіх псіхатраўмаў. Як вядома, нервовая сістэма дзяцей недасканалая, а таму можа лёгка надысці яе перанапружанне, што, у сваю чаргу, і прыводзіць да развіцця неўрозу.**

Паводле слоў **валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ,** асноўнымі прычынамі дзіцячых неўрозаў з'яўляюцца неспрыяльны маральны клімат у сям'і, садку, школе; завышаныя патрабаванні бацькоў, настаўнікаў, выхавацеляў, без уліку індывідуальных асаблівасцяў і магчымасцяў; ранняя празмерная нагрузка нервовай сістэмы, калі дзіця спрабуюць навучаць і замежнай мове, і музыцы, і маляванню і г.д.; адсутнасць станоўчых эмоцый, разумення з боку бацькоў і равеснікаў; стрэс, абумоўлены сполахам; сітуацыі, якія працягла траўмуюць псіхіку, — канфлікт у школе, алкагалізм бацькоў, цяжкія захворванні сваякоў, жорсткае стаўленне бацькоў; неадэкватныя выхаваўчыя меры; працяглы прагляд тэлебачання і камп'ютарныя гульні.

Часцей неўроз развіваецца ў дзяцей, якія лёгка крыўдзяцца, не ўпэўненыя ў сабе, маюць хранічныя саматычныя захворванні, не маюць дастатковай фізічнай нагрузкі; якія знаходзяцца ў «крытычным» узросце: 2,5-3 гады, 7-9 гадоў, 11-12 (у дзяўчынак) і 13-14 (у хлопчыкаў).

Для ўсіх формаў неўрозаў характэрныя зніжэнне настрою, расстройства сну і парушэнне апетыту. Насцярожыць павінны таксама змены паводзін, нечаканае ўзбуджэнне, імкненне да адзіноты, з'яўленне боляў у жываце, у сэрцы, галаўных боляў. Лячэннем неўрозаў займаюцца ўрач-псіханеўролаг, урач-псіхатэрапеўт, псіхолаг. Прымяняюцца медыкаментознае лячэнне, гамеапатыя, гіпноз, гульнявая тэрапія, фізіятэрапія, масаж, іголкарэфлексатэрапія, музыкатэрапія і інш. Вялікае значэнне пры гэтым мае работа з усёй сям'ёй.

Для папярэджвання неўрозаў неабходна стварыць вакол дзіцяці атмасферу добразычлівасці, клопату, узаемаразумення, спрыяць павышэнню яго самаацэнкі, быць паслядоўным у выхаванні і прымяняць карныя меры толькі ў выключных выпадках, лічыцца з жаданнямі самога дзіцяці.

# АГРЭСІЎНАСЦЬ З-ЗА ГІПЕРАКТЫЎНАСЦІ?

**Праява дзіцячай агрэсіі з'яўляецца адной з найбольш распаўсюджаных формаў парушэння паводзін, з якімі даводзіцца мець справу бацькам, выхавацелям, псіхолагам і псіхатэрапеўтам.**



Назіранне за малымі ў адной з дашкольных устаноў паказала, што большасць маленькіх выхаванцаў час ад часу праяўляла фізічную агрэсію: дзеці разбуралі пабудаваныя іншымі фігуркі, ламалі цацкі, біліся, кусаліся і г.д. Наогул з дапамогай агрэсіўнасці чалавек імкнецца прыцягнуць увагу да сябе, падкрэсліць сваю перавагу, абараніцца ад нападу, крыўды, падману. Гэта можа быць жаданне адчуваць сябе галоўным, імкненне атрымаць пажаданае любой цаной, жаданне атрымаць задавальненне ад нанесенай іншаму крыўды, а можа быць і імітацыя паводзін дарослых ці асаблівасць нервовай сістэмы, спадчыннасць, уздзеянне алкаголю.

У дзяцей рознага ўзросту агрэсіўнасць праяўляецца па-рознаму. Скажам, у 1-2-гадовых дзяцей успышка гневу і фізічны напад на равесніка абумоўлены канфліктам з-за валодання цацкамі. У 3-гадовым узросце крык, плач, кусанне, тупанне нагамі звязаны з абмежаваннем дарослымі пазнавальнай актыўнасці малога. У любым выпадку дарослым неабходна захоўваць спакой — гэта лепшы спосаб рэагавання на агрэсіўныя паводзіны. Варта пазбягаць фізічнага пакарання: частае прымяненне такіх прыёмаў нараджае звычку да агрэсіі, ад якой недалёка і да агрэсіўнасці. Нельга звяртацца да прыніжальнага маральнага пакарання: у дзіцяці можа з'явіцца надзвычайная жорсткасць, патаемная агрэсіўнасць, жаданне помсты.

Умяшанне спецыялістаў патрабуецца ў двух выпадках. Першы — калі дзіця ва ўзросце ад 5 гадоў атрымлівае задавальненне, калі мучыць іншых дзяцей або жывёл. Другі — гіперактыўнае дзіця. Такое дзіця неспакойнае, агрэсіўнае, яго паводзіны імпульсіўныя, неабдуманыя. Дзіця можа быць у душы любячым, але біяхімічны дысбаланс кары галаўнога мозга робіць яго паводзіны звышактыўнымі. Такая імпульсіўнасць дзіцяці — прадмет клопату ўрача, які можа выпісаць патрэбныя лекі.

У любым выпадку самае важнае — каб дзіця не адчувала сябе адзінокім, няшчасным і нікому не патрэбным. Да дзіцяці трэба ставіцца з разуменнем і любоўю, вучыць дабрыні, неабходна аналізаваць прычыны агрэсіўных паводзін, прадастаўляць дзіцяці магчымасць расходаваць энергію, не адказваць агрэсіяй на агрэсію. Перш за ўсё, самі дарослыя павінны перастаць быць агрэсіўнымі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# МАЛАДАЯ МАЦІ, ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, ЗМОЖА БЯСПЛАТНА АТРЫМЛІВАЦЬ ДЗІЦЯЧЫЯ СУМЕСІ

**Дачка жыхара Бабруйска ў пачатку гэтага месяца нарадзіла дзіця. Прыемная падзея, аднак маладая маці тут жа сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі. Паводле слоў бацькі, у яе няма свайго малака. Звярнулася ў органы сацыяльнай абароны на атрыманне бясплатнага дзіцячага харчавання — малочных сумесяў, а таксама памперсаў. Аднак там дзяўчыне адмовілі: маўляў, не маеце права. Дык ці праўда, што яго дачка не будзе атрымліваць бясплатнае дзіцячае харчаванне і памперсы для немаўляці, пытаўся наш заяўнік.**

Як высветлілася, клапатлівы бацька і дзядуля некалькі апярэдзіў падзеі: яго дачка яшчэ нікуды не звярталася, а толькі збіралася гэта зрабіць. Разабрацца ў сітуацыі нам вельмі аператыўна дапамагла начальнік упраўлення сацыяльнай абароны адміністрацыі Ленінскага раёна г. Бабруйска Святлана Грынявіцкая.

— Сям'я мае права на атрыманне бясплатнага дзіцячага харчавання, калі сярэднедушавы даход у ёй за месяц, які папярэднічаў месяцу звароту па дапамогу, быў ніжэйшы за крытэрый патрэбнасці (у грашовым выражэнні гэта 843 870 рублёў), — паведаміла Святлана Вітальеўна. — Я пагутарыла з дачкой вашага заяўніка, і яна паведаміла, што перад нараджэннем дзіцяці не працавала. Да таго ж яна — маці-адзіночка. Мяркуючы па ўсім, права на атрыманне бясплатнага дзіцячага харчавання ў яе ёсць. Дзяўчыне трэба падысці да нас з пакетам дакументаў. Патрэбны будуць заява ад яе, пашпарт, пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці, працоўная кніжка, даведка аб даходах за перыяд са жніўня мінулага года па ліпень гэтага, даведка ад урача-педыятра аб рацыёне харчавання дзіцяці. Астатнія даведкі — з домаўпраўлення і аб саставе сям'і (што яна з'яўляецца маці-адзіночкай) — запросім мы самі. Дарэчы, калі даходы ў сям'і будуць невялікімі, дзяўчына мае права звярнуцца па адрасную сацыяльную дапамогу — напрыклад, каб набываць тыя ж памперсы для дзіцяці.

Што датычыцца апошніх, дык як у самім Бабруйску, так і па Магілёўскай вобласці, як удакладніла начальнік упраўлення сацыяльнай абароны адміністрацыі раёна, яны бясплатна не выдаюцца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПЯТНІЦА, 31 ЖНІЎНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.10, 7.35, 8.15, 8.35** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.30** Навіны.
**7.05, 8.05, 18.45, 1.20** Зона Х.
**7.30, 8.30** Дзелавое жыццё.
**9.10 Серыял «За ўсё табе дзякую-3».**
**10.10** Сфера інтарэсаў.
**10.35** Журналісцкае расследаванне. «У барацьбе з цвярозым сэнсам».
**11.10, 19.55 (заключная серыя) Серыял «Калі яго зусім не чакаеш...».**
**12.10 Серыял «Маргоша».**
**14.00 Серыял «Зорная брама. Першы атрад».**
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Майстар падарожжаў». «Антычная Еўропа».
**16.05** «Усё як трэба!».
**16.30** Ток-шоу «Перазагрузка».
**17.20 Серыял «Маруся. Вяртанне».**
**18.15** Каробка перадач.
**19.40** Калыханка.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Лёс гігантаў». «Цвёрдая пасадка «ЯКа».
**22.10** Ток-шоу «Не толькі жанчына ведае».
**23.10 Баявік «Чорны дождж».**
**1.45** Дзень спорту.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Паміж намі, дзяўчатамі».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Валерый Абадзінскі. Выкрадзенае жыццё».
**12.05 Серыял «Сэрца Марыі».**
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольная закупка».
**14.10** «Модны прыгавор».
**15.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**17.00** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «ДОстояние РЕспублики».
**23.05 Драма «Ромавы дзённік».**
**1.15** Начныя навіны.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05** Час футбола.
**9.45, 17.55 Серыял «Пацалунак Сакрата».**
**10.50** Еш і худзей.
**11.20** Школа рамонту.
**12.30** Страсці па культуры.
**13.15 Серыял «Лігаўка».**
**14.20** Скетч-шоу «Халі-галі».
**14.45 Камедыя «Як Майк».**
**16.40** Жансавет.
**17.15** Беларуская кухня.
**19.00** Выбары-2012.
**20.00** Бітва экстрасэнсаў.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Футбол. Суперкубак УЕФА. «Чэлсі» — «Атлетыка».
**23.55** Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**0.40 Камедыя «Марго на вяселлі».**

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Аўтапанарама».
**8.50 Драма «Інфарматары».**
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35 Серыял «Які памнажае смутак». Заключная серыя.**
**13.05** «Кінагісторыі: «Кур'ер».
**13.50 Серыял «Рускі сродак».**
**14.40 Серыял «Забойная сіла 6».**
**15.35** «Гадзіна суда».
**16.50 Серыял «Следакі».**
**18.30** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**19.00** «ВЫБАРЫ-2012». Выступленні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.40 Камедыя «Брама Афіны».**
**23.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**23.50** «Расійская покерная серыя».
**0.40** «Прыгоды сэксу ў XX стагоддзі».

### МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці. (Бягучы радок.)
**5.05, 6.05 Серыял «Выляччэнне каханнем».**
**7.05** «Цік-так».
**7.25** «Ёга Life».
**8.05** «Энцыклапедыя смаку».
**8.35, 9.05, 10.05 Серыял «Трымай мяне мацней».**
**11.05** «Рэспубліка сёння».
**11.25** «Смачны свет. Ненецкая кухня».
**12.20, 2.05 Маст. фільм «У бары брусніцы».**
**15.25** Парад, прысвечаны Дню Незалежнасці Кыргызстана.
**16.25** «Наша марка».
**17.05** «Злачынства і пакаранне».
**17.35** «Простая мова».
**18.25** «Акцэнты».
**18.40** Дак. фільм «Зроблена ў СССР».
**19.10 Маст. фільм «Вяртанне блуднага мужа».**
**21.20** «Неверагодная праўда пра зорак».
**22.20** Канцэрт да Дня Незалежнасці Кыргызстана.
**0.20** «Добрыя жарты».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.10, 18.55, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 14.15 Серыял «Выратуй мяне».**
**8.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**8.50, 15.40** «Кінаблакнот».
**9.10, 17.50 Серыял «Дзённік доктара».**
**10.10** «Мой любімы гадаванец».
**10.40, 19.00 Серыял «Пасрэднік».**
**12.15 Серыял «Гаваі».**
**16.00** Мультпарад».
**16.25** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Аднойчы ў казцы».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Трылер «Версія».**
**23.05 Серыял «Сховішча».**

### ВТБ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 0.40** «PLAY».
**8.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 18.30** «Гісторыі ў дэталях».
**9.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00** «Добрыя жарты».
**12.00** «Гарадское падарожжа з Паўлам Любімцавым».
**13.00, 22.10** «Не можа быць».
**14.00** «Двое».
**15.00** «Маленькія жанчыны».
**16.00** «Скажы, што не так?!».
**17.00, 19.00 Серыял «Цацкі».**
**17.30, 19.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**21.00** «Смех у вялікім горадзе».
**23.10** «Па-за законам».
**23.40** «Дарожныя войны».
**0.10 Дэтэктыў «Шлюбнае чытво».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.05 Серыял «Салямі».**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Навіны культуры.
**12.00** «Прамы эфір».
**12.50 Серыял «Інстытут высакародных дзяўчат».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.45** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «1000 дробязяў».
**15.10** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.55** «Вымяральнік розуму. IQ».
**17.30** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**17.45** Весткі. Дзяжурная часць.
**17.55** «Кахаю, не магу!».
**18.55 Серыял «Ефрасіння. Працяг».**
**20.30** «Юрмала».
**22.05 Меладрама «Арыфметыка падласці».**
**23.55 Меладрама «Калі б я цябе кахаў...».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05** «НТБ раніцай».
**8.35 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**9.35, 15.40, 18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Крамлёўскія пахаванні».
**11.10** «Да суда».
**12.05, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Сярод белага дня».
**15.15** «Справа густу».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.25** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**18.10** «Прафесія — рэпарцёр».
**19.30 Маст. фільм «Кома».**
**21.20 Серыял «Глухар. Вяртанне».**
**22.20 Серыял «Пятніцкі».**
**0.15 Серыял «Неба ў агні».**

### ІНТЭР+

**7.00, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** Раніца з ІНТЭРам.
**7.30, 22.10, 3.40** Спорт у Падрабязнасцях.
**9.10, 13.25** Інсайдар.
**9.40 Серыял «Два бакі адной Ганны».**
**10.25** Арол і рэшка.
**11.15, 20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**12.15** Знак якасці.
**12.40 Серыял «Паўтор пройдзенага».**
**13.50** Купаж.
**14.05** Сямейны суд.
**14.50** Судовыя справы.
**15.30** Легенды крымінальнага вышуку.
**16.00 Серыял «Ракавое падабенства».**
**16.55 Маст. фільм «Гараджане».**
**18.20, 5.15** Дак. фільм «Выдатныя жанчыны 20-га стагоддзя».
**19.10, 2.15** Пра жыццё.
**20.00, 3.00** «Падрабязнасці».
— А цяпер п'юць, — кажа медычка, — напэўна, ад таго, што бацькі дазволілі сваім дзецям многае. Пасляваеннае пакаленне перажыло недахоп, і таму вырашылі: няхай у дзяцей будзе ўсё. Дастатак не заўсёды на карысць.

Цяпер, кажа Вера Цімафееўна, увогуле і хварэюць больш.

— Сярод пацыентаў у Косцінцы калісьці ў мяне была толькі адна жанчына, у якой балела паясніца, — расказвае Дземідзенкава. — Людзі працавалі, аралі на сабе, малацілі рукамі. І ні ў каго не балелі ні ногі, ні рукі. Цяпер — ледзь не кожны пакутуе. І я лічу, што тут вінаватая экалогія: усеагульная хімізацыя, разам з радыяцыяй. Яны робяць сваю «чорную справу». Людзі слабыя, і нават простыя хваробы накшталт прастуды цягнуцца доўга, упарта і пакутліва.

Таксама фельчарка лічыць, што цяпер трэба пільна сачыць за крывяным ціскам, каб не дапусціць інфарктаў. Гэта датычыцца не толькі старых, але і досыць маладых людзей.

— Зноў-такі вінаватая экалогія, а таксама, як гэта ні дзіўна прагучыць, добрае харчаванне, залішняя ежа, — дзеліцца сваім меркаваннем сельскі медык. — Каўбасу цяпер можна есці штодня, а гэта не карысна. Трэба, так бы мовіць, пасціцца: есці агародніну, малочныя прадукты, садавіну. Калі маці ў жніво агурок зрывала з градкі і з кропам з'ядала — тады і сіла ў руках была. А мяса наесціся — адразу хочацца паляжаць, ці не так?

Вера Цімафееўна — кваліфікаваны і вопытны фельчар. Але яна ўпэўнена, што ўсё ж такі галоўнае для медыка — гэта не толькі прафесійныя навыкі, але і добразычлівасць.

— Трэба з добрай душой падысці да чалавека, выслухаць яго, дапамагчы і растлумачыць, даць лекі, даць надзею і настрой на лепшае. Людзі хочуць увагі да сябе.

**Ілона ІВАНОВА, фота аўтара.**

*Магілёўскі раён.*

# ЗАХАРЭВІЧ І ФІНБЕРГ УВАЙШЛІ Ў САВЕТ СТАРЭЙШЫН

**Губернатар Мінскай вобласці Барыс Батура на сустрэчы з Саветам старэйшын павіншаваў новых членаў, прынятых у гэтую структуру. Гэта паважаныя і вядомыя ў краіне людзі, Ганаровыя грамадзяне Мінскай вобласці — артыстка драмы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Марыя Захарэвіч і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь Міхаіл Фінберг.**

У Савеце старэйшын, які працуе пры Мінскім аблвыканкаме ўжо 10 гадоў, 30 чалавек. Гэта людзі, што ўнеслі значны ўклад у развіццё Міншчыны і краіны: былыя кіраўнікі аблвыканкама і іх намеснікі, кіраўнікі прадпрыемстваў, упраўленняў, дэпутаты. Многія з іх узнагароджаны ордэнамі і медалямі за баявыя і працоўныя заслугі. Гэтым людзям і цяпер неабыякавы лёс рэгіёна, краіны. На традыцыйных сустрэчах яны заўсёды абмяркоўваюць злабадзённыя пытанні сацыяльнага, эканамічнага, культурнага жыцця і ўносяць свае прапановы. У прыватнасці, на гэты раз членаў Савета цікавілі шматлікія аспекты дзейнасці ўлады, у тым ліку і па павышэнні заработнай платы. Як адзначыў старшыня Мінаблвыканкама, патрабаванне Прэзідэнта аб дасягненні да канца года зарплаты ў 500 долараў у эквіваленце будзе выканана. Для гэтага ёсць патэнцыял. Але, калі параўноўваць заробкі ў разрэзе раёнаў, то яны адрозніваюцца. Самыя нізкія ў Капыльскім, а самыя высокія — у Салігорскім, Мінскім раёнах і Жодзіне. Ёсць і высокатэхналагічныя прадпрыемствы, дзе работнікі атрымліваюць па 1 тыс. долараў. Сярэдняя ж зарплата па вобласці за першае паўгоддзе склала 3 млн 290 тыс. рублёў. У ліпені яна павялічылася амаль на 500 тыс. рублёў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Прыватны бізнэс неабходна актыўней прыцягваць у сферу адукацыйных паслуг

**Такое меркаванне выказаў першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук.**

Паводле слоў першага намесніка міністра, адной з важных задач, якія цяпер неабходна вырашаць у сістэме адукацыі, з'яўляецца даступнасць дашкольных устаноў. Гэта праблема ў першую чаргу існуе ў буйных гарадах, дзе нават пры наяўнасці месцаў у дашкольных установах назіраюцца цяжкасці з дастаўкай да іх дзяцей.

Задача даступнасці дашкольнай адукацыі вырашаецца рознымі спосабамі, у тым ліку будаўніцтвам новых дашкольных устаноў. Акрамя таго, падкрэсліў Аляксандр Жук, вырашэнне праблемы бачыцца ў тым, каб шукаць магчымасці прыцягнення бізнэсу, прадпрымальнікам неабходна прадаставіць магчымасць адкрываць прыватныя сады. «Пад'язджаючы, напрыклад, да Гродна, бачыш шмат прыгожых катэджаў, упэўнены, тут пражывае нямала бацькоў, якім пад сілу адпаведным чынам прафінансаваць знаходжанне дзяцей у такіх установах», — дадаў першы намеснік міністра.

**БЕЛТА.**

# КНІГІ РУДАБЕЛЬСКАГА КРАЮ

**Гарадскі пасёлак Акцябрскі — адзін з самых маленькіх сярод раённых цэнтраў. Гісторыя гэтай зямлі ўслаўлена ў шматлікіх творах пісьменнікаў і паэтаў. Рудабелка — гераічны край: мінулыя войны і час стваральнай працы пакінулі свой след у лёсах розных пакаленняў.**




Вёска Рудабелка вядомая яшчэ з IV стагоддзя. У 1917 годзе тут быў створаны валасны рэвалюцыйны камітэт, які абвясціў савецкую ўладу. У часы грамадзянскай вайны і белапольскай інтэрвенцыі ў 1918-1920 гадах тут знаходзіўся цэнтр так званай «Рудабельскай рэспублікі». У гады Вялікай Айчыннай вайны у гэтай мясцовасці быў цэнтр Акцябрска-Любанскай партызанскай зоны, захоўвалася савецкая ўлада, працавалі школы, электрастанцыя, майстэрні.

З творамі пра гісторыю Рудабелкі можна пазнаёміцца ў мясцовай карціннай галерэі, якая носіць імя земляка Леаніда Дробава — мастака, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

У Акцябрскай раённай бібліятэцы арганізаваная папулярная форма абмену кнігамі буккросінг, дзе чытачы пакідаюць сваю прачытаную літаратуру для наступных аматараў. Творы пра гісторыю, культуру, прыроду Рудабельскага краю карыстаюцца попытам у чытачоў розных узростаў.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**

■ Ліга чэмпіёнаў

# НАВУКА АД ПРАФЕСАРА




**Два трапныя ўдары Віталя Радзівонава дазволілі БАТЭ зарабіць перамогу (2:0) у хатнім матчы плэй-оф Лігі чэмпіёнаў з ізраільскім «Хапаэлем».**

На трыбунах «Дынама» вольных месцаў сапраўды хапала. Аднак і тыя 16 тысяч адданых прыхільнікаў барысаўчан, якія трапілі на матч, наўрад ці пашкадавалі, што правялі позні вечар на стадыёне. Напэўна, задаволеным застаўся і суддзя матча Ховард Уэб, афіцэр брытанскай паліцыі, які абслугоўваў фіналы апошняга чэмпіянату свету і Лігі чэмпіёнаў. Уэб у святле пражэктараў блішчаў сваёй вядомай на ўвесь свет лысінай і ўсміхаўся. Ён хоць і прадэманстраваў футбалістам 6 жоўтых і адну чырвоную картку, але правёў гульню выдатна, як мае быць. БАТЭ гэтым вечарам таксама быў на вышыні. Клуб нібы выпрастаўся, дзейнічаў лёгка. І ў атацы ўсё было зроблена на тым узроўні, пра які кажуць: амаль ідэальна. Не хапала толькі трапнасці. Вось гэта крыху і засмуціла. Чэмпіён згубіў столькі момантаў, колькі зрэдку наогул бывае ў матчах падобнага ўзроўню. Часам здавалася, што футбалісты наўпрост імкнуцца занесці мяч у вароты адважнага галкіпера Дані Амоса. Выратаваў усіх Віталь Радзівонаў па мянушцы Прафесар. Менавіта яго стрэлы прынеслі БАТЭ вікторыю ў даволі важным паядынку. Сказаць, што хлопцы Віктара Ганчарэнкі былі проста мацнейшыя за «Хапаэль» з Кір'ят-Шмоны, — значыць не сказаць нічога. Барысаўчане ў гульнявым складніку былі ў гэты дзень на дзве галавы вышэй за сваіх візаві. І толькі памылкі абаронцаў беларускай каманды дазвалялі зрэдку накаляць абстаноўку каля варот БАТЭ.



— Хочацца асобна адзначыць балельшчыкаў, якія сёння нас цудоўна падтрымлівалі, — прызнаўся на прэс-канферэнцыі Віктар Ганчарэнка, галоўны трэнер БАТЭ. — Мы стварылі шмат момантаў. Безумоўна, хацелася б, каб з рэалізацыяй было лепш. Мы арганізавалі шмат хуткіх атак, вострых перадач. А дакладных удараў нанеслі няшмат. Тым не менш, трэба адзначыць, што для раўнда плэй-оф лік 2:0 — даволі камфортны.

Коратка, змястоўна і зразумела. Спадзяёмся, што і матч у адказ для беларусаў будзе ўпэўненым — па ліку і па гульні.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота Настассі ХРАЛОВІЧ**

■ Алімпійцы

# Добра, а можна лепш

**Спартсмены Мінскай вобласці могуць разлічваць на дапамогу ў падрыхтоўцы да наступнай Алімпіяды, што адбудзецца ў Бразіліі. У гэтым запэўніў губернатар вобласці Барыс Батура на сустрэчы з удзельнікамі XXX летніх Алімпійскіх гульняў і іх трэнерамі.**

У сёлетнім міжнародным спартыўным форуме ўдзельнічаў 31 спартсмен Мінскай вобласці ў 14 відах спорту. Чэмпіёнам па кулявой стральбе стаў Сяргей Мартынаў. Ірына Кулеша і Ірына Памелава заваявалі «бронзу», адпаведна, па цяжкай атлетыцы і грэблі на байдарках і каноэ.

Старшыня аблвыканкама, а таксама старшыня Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі па Мінскай вобласці Аляксандр Ярмак уручылі прызёрам Ганаровыя граматы аблвыканкама і грашовыя прэміі. Грашовыя ўзнагароды атрымалі і іх трэнеры.

— Бясспрэчна, алімпійцы паказалі нядрэнныя вынікі, але заўсёды хочацца большага. Унёсак у агульную скарбонку спартсменаў Міншчыны можа быць больш значны, — канстатаваў губернатар і паабяцаў усялякае садзейнічанне ў падрыхтоўцы да будучых Алімпійскіх гульняў.

Па словах Барыса Батуры, у вобласці робіцца шмат па стварэнні дастойных умоў для трэніровак, развіцця спартыўнай базы, масавай фізкультуры і спорту. На працягу двух гадоў у кожным раённым цэнтры будзе па плавальным басейне. Да наступнага футбольнага сезона адкрыецца новы стадыён у Барысаве — адзін з лепшых у вобласці.

На думку начальніка ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінаблвыканкама, трохразовага чэмпіёна свету па біятлоне Пятра Івашкі, планавалася, што спартсмены вобласці возьмуць 5 медалёў. Але пры той сітуацыі, якая склалася, і такі вынік нядрэнны. Чатыры спартсмены — Кацярына Карстэн, Анастасія Пракапенка, Анастасія Новікава і Анастасія Міронычык-Іванова — занялі ў сваіх відах спорту 5-7 месцы. У гэтых спартсменаў высокі патэнцыял, і яны маглі б выступіць лепш. Але ў спорце не ўгадаеш: паўплываць на вынік можа любы фактар, у тым ліку і суб'ектыўны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

## З ЦЯГНІКА ВЫКІНУЛІ ТАВАРУ БОЛЬШ ЯК НА 27 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

**Каля 23 гадзін гэта заўважыў памежны нарад пры суправаджэнні цягніка «Беласток — Гродна» ад лініі беларуска-польскай мяжы да чыгуначнай станцыі «Гродна».**

Паводле інфармацыі прэс-сакратара Гродзенскай памежнай групы падпалкоўніка Сяргея Шумейкі, у чатырох поліэтыленавых пакетах аказалася 198 пар жаночых джынсавых штаноў. Папярэдняя сума ацэнкі тавару, які перададзены супрацоўнікам Гродзенскай рэгіянальнай мытні, складае 27 мільёнаў 700 тысяч рублёў. Відавочна, што яго выкінулі з цягніка, каб потым забраць, пазбегнуўшы мытных плацяжоў. Зразумела, што па гэтай жа прычыне ўладальнік кантрабанднага тавару палічыў за лепшае сябе не афішыраваць.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## БУДУЧЫЯ ВЕТЭРЫНАРЫ «ПАПАЛІСЯ» НА МЯСЕ

**Незаконныя здабыча і гандаль свежым мясам скончыліся для траіх будучых ветэрынараў — цяпер ужо былога студэнта Віцебскай ветэрынарнай акадэміі і двух экс-навучэнцаў аграрнага каледжа — не толькі выключэннем з установ адукацыі, але і абвінаваўчым прысудам.**

— Увесну гэтага года трое будучых спецыялістаў ветэрынарнай справы вырашылі выкрасці цялят з фермы, якая належыць аграрнаму каледжу. Старанна ўсё спланаваўшы, вечарам пачалі ажыццяўляць задуманае. Пад'ехалі на машыне з прычэпам да абумоўленага месца. Машыну схавалі, а самі пешшу пайшлі праз поле да фермы. Пасля таго як пераканаліся ў адсутнасці ахоўы, зайшлі ў памяшканне цялятніка і выбралі траіх цялят. Жывёл спакойна вывелі з фермы, а пасля загрузілі ў сваю машыну, — расказвае Наталля Сеўрукова, пракурор арганізацыйна-кантрольнага аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці. — Ад'ехаўшы трохі ад месца здарэння, цялят зарэзалі спецыяльна ўзятымі з сабой нажамі. Тушы пакінулі на закінутай ферме, а самі адправіліся дадому. На наступны дзень патэлефанавалі знаёмаму, якому прапанавалі купіць, а калі не хоча, рэалізаваць свежае мяса. Знаёмы хутка дамовіўся аб сустрэчы з патэнцыйным пакупніком.

Хлопцы, забраўшы дзве разабраныя тушы, прыехалі на сустрэчу. Пакупніком аказалася жанчына, якая гандлявала свежым мясам на адным з віцебскіх рынкаў. Яна адразу ж пацікавілася, адкуль мяса ў маладых людзей. У адказ пачула, што яны, маўляў, самі вырошчваюць маладняк буйной рагатай жывёлы. Так бы мовіць, «фермеры». Як вопытны ў такіх справах чалавек, жанчына папрасіла даведку. Хлопцы запэўнілі, што прывязуць яе пазней.

За здзяйсненне крадзяжу, які быў учынены групай асоб, суд Віцебскага раёна прысудзіў аднаго «ветэрынара» да 2 гадоў 6 месяцаў пазбаўлення волі без канфіскацыі маёмасці, а дваіх яго таварышаў — да 2 гадоў пазбаўлення волі без канфіскацыі маёмасці. Пры гэтым кожнаму пашчасціла атрымаць адтэрміноўку выканання пакарання — на 2 гады 6 месяцаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ «Звяздзе» адказваюць

# «НЕСАЛОДКІЯ СПРАВЫ... МЁДУ»

**Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь разгледзела артыкул Любові Каспяровіч «Несалодкія справы... мёду», апублікаваны ў газеце «Звязда» 20 ліпеня 2012 года.**

Рэдакцыя атрымала адказ за подпісам намесніка міністра Мінсельгасхарчу Васіля Паўлоўскага. У прыватнасці, у лісце адзначаецца:

«У цяперашні час пытанні, што датычацца пчалярства, адлюстраваны:

— у «Рэспубліканскай праграме па племяннай справе ў жывёлагадоўлі на 2011—2015 гады», зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2010 г. № 1917, у якой вызначаны мерапрыемствы па развіцці племяннога пчалярства ў атэставаных племянных пчалярскіх арганізацыях і іх фінансавая падтрымка;

— у «Дзяржаўнай праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця і комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў Прыпяцкага Палесся на 2010—2015 гады», зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 кастрычніка 2010 г. № 1578;

— у «Праграме развіцця і падтрымкі асабістых падсобных гаспадарак грамадзян у 2011—2015 гадах», зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2010 г. № 1917.

У рэспубліцы дзейнічае інструкцыя «Аб мерапрыемствах па папярэджанні і ліквідацыі хвароб, атручэнняў і асноўных шкоднікаў пчол на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», зацверджаная пастановай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2003 года № 31, дзе выкладзены асноўныя патрабаванні сістэмы ветэрынарнага кантролю пчальнікоў.

Парадак утрымання пчаліных сем'яў у садовых таварыствах рэгламентуецца Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2011 г. № 1048 «Аб некаторых пытаннях рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.01.2008 г. № 50», у якой прадугледжваюцца парадак і правілы ўтрымання пчаліных сем'яў на тэрыторыі дачных участкаў. Загадам Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ад 25 мая 2012 г. № 162 з 1 жніўня 2012 г. вызначаны нормы ўтрымання пчаліных сем'яў на прысядзібных участках «Тэхнічны кодэкс ТКП 45-3.01. — 2008 «Горадабудаўніцтва. Раёны сядзібнага жыллёвага будаўніцтва».

У частцы выкарыстання і прымянення сродкаў аховы раслін у рэспубліцы дзейнічае пералік нарматыўных дакументаў, якія рэгламентуюць бяспечнае для пчол прымяненне пестыцыдаў у пасевах сельскагаспадарчых культур, што ўключае ў сябе:

— санітарныя правілы і нормы 2.2.3.12 — 17 — 2003 «Гігіенічныя патрабаванні да захоўвання, прымянення і транспарціроўкі пестыцыдаў і аграхімікатаў»;

— Дзяржаўны рэестр сродкаў аховы раслін (пестыцыдаў) і ўгнаенняў, дазволеных да прымянення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

— «Інструкцыі па прафілактыцы атручэння пчол пестыцыдамі» (Масква, ГАП СССР, 1989 г.).

Рэгламенты прымянення з мэтай забеспячэння бяспекі для пчол прапісаны ў Санітарных правілах і нормах 2.2.3.12-17-2003 (глава 2, пункт 2.24): «У мэтах забеспячэння бяспекі прадукцыі пчалярства і аховы пчол ад уздзеяння прэпаратаў, апрацоўку варта праводзіць у познія гадзіны шляхам апырсквання наземнай апаратурай, пры гэтым, пасля папярэдняга апавяшчэння праз сродкі масавай інфармацыі за 4—5 сутак аб тэрмінах, зоне і характары дзеяння запланаваных да выкарыстання сродкаў аховы раслін, пчальнікі неабходна вывезці на адлегласць не менш чым на 5 км ад участкаў, што апрацоўваюцца, або ізаляваць пчол на тэрмін, пазначаны ў Рэестры». У адпаведнасці з СаНПіН (пункт 2.21) інфармаванне насельніцтва пра час і месца правядзення апрацоўкі пестыцыдамі ўскладзена на суб'екты гаспадарання праз радыё, тэлебачанне, газеты, аб'явы ў населеных пунктах і іншыя сродкі інфармацыі.

У гэтым годзе для ўпарадкавання правядзення апылення сельскагаспадарчых культур і правядзення качавання пчальнікоў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання накіравала ў камітэты па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкамаў рэкамендацыі па арганізацыі апылення сельскагаспадарчых культур і качаванні пчальнікоў. Адначасова старшыням камітэтаў па сельскай гаспадарцы аблвыканкамаў даручана падчас правядзення хімахоўных работ узяць пад жорсткі кантроль пытанні арганізацыі апылення энтамафільных сельскагаспадарчых культур, пладова-ягадных насаджэнняў, забеспячэння выканання патрабаванняў пры правядзенні ахоўных мерапрыемстваў супраць шкоднікаў і хвароб.

Што да структуры кіравання галіной пчалярства ў рэспубліцы, то ў адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі ад 25 лістапада 2010 г. № 334 РП «Аб бязвыплатнай перадачы маёмасці» ПТ РУП «Белпчалярства» перададзена з рэспубліканскай формы ўласнасці ва ўласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак».

Даты | **Падзеі** | Людзі



**960** год — нарадзілася Рагнеда Рагвалодаўна, полацкая князёўна, асветніца. Дачка полацкага князя Рагвалода, жонка вялікага князя Уладзіміра Святаславіча, маці князя Ізяслава Уладзіміравіча. Згодна з летапісам, адхіліла сватаўство Уладзіміра Святаславіча, які княжыў у Ноўгарадзе. Каля 980 года Уладзімір захапіў Полацк і забіў бацьку, маці і двух братоў Рагнеды, а яе гвалтоўна зрабіў сваёй жонкай. Спрабуючы адпомсціць, яна здзейсніла няўдалы замах на жыццё князя. Паводле падання, пасля хрышчэння князя і ліквідацыі яго гарэма Рагнеда адмовілася ў другі раз выйсці замуж і пастрыглася ў манашкі пад іменем Анастасія. Памерла ў 1000 годзе. У Заслаўі ўсталяваны помнік Рагнедзе і яе сыну.

**1572** год — адзін з самых крывавых дзён у гісторыі Францыі. У Парыжы ў Варфаламееўскую ноч каталікі літаральна выразалі пратэстантаў-гугенотаў, якія з'ехаліся ў сталіцу на вяселле свайго лідара, караля Генрыха Наварскага і каралевы Маргарыты, сястры караля Францыі Генрыха Валуа. Бойня, арганізаваная герцагам Латарынгіі Генрыхам Гізам, працягвалася тры дні. Любы, у каго не было белага крыжа на капелюшы, становіўся ахвярай натоўпу. За гэты час былі знішчаны, па розных звестках, ад 10 да 30 тысяч чалавек. Кажуць, што ў тыя дні каралева Кацярына Медычы вымавіла: «Быць з імі жорсткімі — чалавечна, а быць міласэрнымі — жорстка». Менавіта з гэтага дня ў Францыі аднавіліся рэлігійныя войны.

**1949** год — нарадзіўся (вёска Моладава Іванаўскага раёна) Пётр Іванавіч Брыгадзін, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук (1995), прафесар (1995), заслужаны работнік адукацыі Беларусі (1999). З 2000 года — рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, з 2001-га — міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь. Затым працаваў дырэктарам Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ. Даследуе гісторыю Беларусі XIX—XX стагоддзяў, палітычную гісторыю, праблемы дзяржаўнага кіравання.

### Было сказана

**Леў Сапега (1557—1633), дзяржаўны і вайсковы дзеяч ВКЛ:**

*«Мэта і вынік усіх законаў, што існуюць на свеце,- каб кожны добрую славу сваю, здароўе і скарб-нажытак меў непашкоджанымі і страты ў гэтым ніколі не меў».*


**Уважаемые акционеры!**

Открытое акционерное общество «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин извещает акционеров о проведении 12 сентября 2012 года в 14.00 внеочередного общего собрания акционеров в очной форме по адресу: г. Кобрин, ул. Советская, 109, зал заседаний.

Повестка дня общего собрания:

1. Об утверждении изменения в устав ОАО «Гидромаш» г. Кобрин.
2. Об изменении состава ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 13.00 до 13.45 в день и по месту проведения собрания на основании: акционер – паспорт; представитель – паспорт и доверенность, оформленная в соответствии с действующим законодательством.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 31 августа 2012 г.

*УНП 200093330*

***Наблюдательный совет открытого акционерного общества «ДСТ № 2, г. Гомель» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 4 августа 2012 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж, зал совещаний.***

**Повестка дня:**

1. О внесении изменений в Устав Общества.

Начало собрания в 10.00.

Регистрация акционеров, их представителей с 9.00.

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.

*УНП 400022426*

Страховой сертификат «Зеленая карта» № 7660672 серия BY/03/ ЗАСО «Белнефтестрах» считать недействительным.

*УНП 101143603*

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА**

**«Строительство многоэтажного жилого дома, со встроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой № 10 по генплану в микрорайоне Каменная Горка-2».**
**Общество с ограниченной ответственностью «Футбольный клуб «Сквич» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.**

**Информация о Застройщике.**

ЗАСТРОЙЩИК (Заказчик) – ООО «Футбольный клуб «Сквич».

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 26 ноября 2004 года № 2391 в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190583075.

В течение предыдущих лет организацией осуществлялось строительство 3-х многоэтажных жилых домов серии М 111-90 в границах улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко во Фрунзенском районе города Минска, генподрядчиком которых являлась строительная организация ОАО «МАПИД».

Информация о проекте.

**Цель строительства** – ввод в эксплуатацию жилого дома, со встроенными помещениями и подземной гараж - стоянкой № 10 по г/п в микрорайоне Каменная Горка-2.

**Объект долевого строительства** – многоквартирный жилой дом **№ 10** по генплану, монолитно - каркасный со стенами из газосиликатных блоков, **состоит из пяти 12-16-18-этажных секций**, со встроенными помещениями общественного и административного назначения на первом этаже и встроено-пристроенным гаражом-стоянкой на 144 машино-мест (304-квартирный жилой дом), с техническим подпольем и тёплым техническим чердаком, высота жилых этажей – 2,6 метра. Категория комфортности по шуму – «В». **Потолки:** монолитно – железобетонные плиты. **Стены** – блоки из ячеистого бетона; **перегородки** – кирпичные (из полнотелого и пустотелого керамического кирпича). **Полы** – железобетонная плита. Вентиляция жилых помещений – естественная. Отопление, электричество, водоснабжение, канализация – городские сети с индивидуальными приборами учета.

Секция оснащена 2 лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг и мусоропроводом.

Наружная отделка: стены – окраска фасадными красками; утепление, металлические элементы окрашиваются эмалями. **Общая площадь квартир – 19999,76 кв. метров. Всего – 304 (триста четыре) квартиры.**

Участок для строительства жилого дома расположен во Фрунзенском районе в городе Минске, система подъездов к проектируемой застройке организована с улиц Проектируемая № 2 – Проектируемая – № 4 на застраиваемой территории.

**Благоустройство территории:** включает подъезд к дому, озеленение, пешеходные дорожки, аллеи, устройство детской и взрослой площадки для отдыха, организацию проездов и гостевых автостоянок, а также площадки для хозяйственных нужд с установкой на них оборудования и малых архитектурных форм.

Для привлечения физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к строительству по договорам создания объекта долевого строительства **25 (двадцать пять) квартир, из них:**

**- однокомнатные –** минимальной общей площадью от 40,26 кв.м, стоимостью 8 340 000= белорусских рублей, что эквивалентно 1 000 (одна тысяча) долларов США за 1 кв. м, по курсу НБ РБ на дату подачи декларации – 10 (десять) квартир;

**- двухкомнатные –** минимальной общей площадью от 57,25 кв.м, стоимостью 8 340 000= белорусских рублей, что эквивалентно 1 000 (одна тысяча) долларов США за 1 кв. м, по курсу НБ РБ на дату подачи декларации – 10 (десять) квартир;

**- трехкомнатные –** минимальной общей площадью от 85,77 кв.м, стоимостью 8 180 000= белорусских рублей, что эквивалентно 1 000 (одна тысяча) долларов США за 1 кв. м, по курсу НБ РБ на дату подачи декларации – 5 (пять) квартир;

**20 машино-мест** стоимостью 166 800 000= белорусских рублей за 1 место, что эквивалентно 20 000 (двадцать тысяч) долларов США, по курсу НБ РБ на дату подачи декларации;

**800 м$^2$ нежилых помещений**, стоимостью 12 510 000= белорусских рублей, что эквивалентно 1 500 (одна тысяча пятьсот) долларов США за 1 кв. м, по курсу НБ РБ на дату подачи декларации.

**Отделка квартир не выполняется.**

Все квартиры – имеют летние помещения (лоджии), окна – из профиля ПВХ.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

**Характеристика встроенных помещений.**

В жилом доме в секциях 1 и 2 располагаются нежилые помещения общественного назначения. Звукоизоляция между помещениями организована согласно норм.

Строительство производится при наличии следующих документов:

- акт выбора места размещения земельного участка, утвержденного 04 марта 2009 года Председателем Минского городского исполнительного комитета;

- свидетельство (удостоверение) № 500/727-5423 о государственной регистрации;

- решение на строительство Минского городского исполнительного комитета № 659 от 17.03.2011 г.;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «ГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА по городу Минску» № 1667-15/10 от 03.01.2011 г.;

- договор строительного подряда – ИП «ГЕРБЕЛИНТОРГТРАНС» № СП-42/07/12 от 05.07.2012 года;

- выданное органом государственного строительного надзора разрешения на производство строительно-монтажных работ от 05.07.2012 г. (№ 2-208 Ж- 029/11).

Начало строительства – 2 квартал 2011 года.

Нормативная продолжительность строительства жилого дома по г/п №10– 20,5 месяца. Предложение, указанное в настоящей Проектной декларации долевого строительства, действует до момента опубликования новой проектной декларации.

Подробные сведения об объекте долевого строительства и условия заключения договоров на строительство можно получить по адресу: 220092, г. Минск, пр. Пушкина 39, офис 6, тел. для справок: 8-029-605-09-09, 257-74-16, 257-30-61. Режим работы: понедельник–пятница с 08:30 до 17:30, обед: с 13:00 до 14:00, выходные дни – суббота, воскресенье.


## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 6.04 | 20.18 | 14.14 |
| Віцебск | — 5.51 | 20.11 | 14.20 |
| Магілёў | — 5.54 | 20.08 | 14.14 |
| Гомель | — 5.54 | 20.01 | 14.07 |
| Гродна | — 6.20 | 20.33 | 14.13 |
| Брэст | — 6.24 | 20.30 | 14.06 |

### Месяц

***Першая квадра ў 16.54. Месяц у сузор'і Стральца.***

### Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Васіля, Максіма, Фёдара.*
***К.** Маліны, Мальвіны, Міхаліны, Барталамея, Юрыя.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

— Вовачка, якой, па-твойму, павінна быць ідэальная школа?
— З зачыненымі дзвярыма.

**Дзяўчына, якая дала абяцанне не есці пасля шасці, выпіла катлету.**

— А не падкажаце, дзе можна нармальна падстрыгчыся?
— Я чуў, у ваенкамаце нядрэнна раўняюць.

**Жанчына ніколі не спазняецца. Яна прыходзіць ці не прыходзіць.**

— Дрэнна без дзяўчат...
— Дрэнна без дзяўчат — гэта яшчэ добра. Вось калі добра без дзяўчат — гэта ўжо дрэнна...





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 27.631. Індэкс 63850. Зак. № 3764.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 жніўня 2012 года.

# ЭТНАСВЯТА КЛІЧА НА ПАЛЕССЕ

**Фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся», які сёння і заўтра праходзіць у вёсцы Ляскавічы, — гэта знаёмства з багаццем рамёстваў, промыслаў, традыцый палескага краю, асноўнымі этапамі развіцця ўнікальнага рэгіёна Беларусі. У гэтым свяце, другім па ліку, бяруць удзел рамеснікі, майстры, навукоўцы, прафесійныя і самадзейныя артысты. Вялікая колькасць людзей робіць фестываль з глыбокай любоўю да сваёй зямлі, каб усе іншыя — землякі і замежнікі — маглі далучыцца да значнай нацыянальнай падзеі, узгадаць, хто ёсць славяне-беларусы-палешукі, адкуль паходзяць карані гасціннай і добразычлівай нацыі...**

## Нават вуліца — Фестывальная!

Два гады таму ў вёску Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці на першы фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» з'ехалася звыш 10 тысяч чалавек — удзельнікаў і гасцей. Арганізатары — Нацыянальны парк «Прыпяцкі», Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Гомельскі аблвыканкам і Петрыкаўскі райвыканкам — нават не чакалі такой непадробнай цікавасці да новага праекта. Скажам, у той жа Польшчы падобныя святы ўжо добра прыжыліся, а для нас гэта быў «першы блін». І ён не аказаўся камяком.

У першую чаргу гасцей захапіў «Горад майстроў»: мясцовыя народныя ўмельцы з некалькіх раёнаў Гомельшчыны і Брэстчыны нагадалі сучаснікам, дзе спрадвеку была найсмачнейшая мачанка і дранікі, вэнджаная рыба і смажаная свежына, мёд з калод і самагонка... Былі і канцэртныя выступленні прафесійных і самадзейных калектываў, кірмаш палескіх рамёстваў, конкурсы рэгіянальных падворкаў і нацыянальнай кухні, выставы-прэзентацыі сацыяльна-культурных праектаў. Былі і катанні на цеплаходах, маторных лодках, чаўнах. Была і дыскатэка з феерверкам!

Да прыёму, вядома, сур'ёзна рыхтаваліся. Каб не проста было дзе перакусіць-пераначаваць, але каб усё да апошняй дробязі было на ўзроўні.

— Безумоўна, за намі ў гэтай справе — добраўпарадкаванне навакольнай тэрыторыі, — расказвае **старшыня Ляскавіцкага сельвыканкама Вольга ЯНКЕВІЧ.** — Наогул, у апошнія гады Ляскавічы моцна змяніліся. Адрадзіліся. Па-першае, у 2008-м вёска атрымала статус аграгарадка. З таго часу былі ўзведзены будынкі разліковакасавага цэнтра, комплекснага прыёмнага пункта, кавярня «Родны кут», гасцініца, непасрэдна адміністрацыйны будынак Нацыянальнага парку, Дом экалагічнай асветы, а таксама жыллё — каля 25 домікаў, 10 з якіх стварылі новую вуліцу — Фестывальную. Быў рэканструяваны стары будынак мясцовай сярэдняй школы, дабудаваны да яго харчовы блок са сталовай, спартыўная зала і стадыён. Рэканструявалі і будынак дзіцячага садка, участковай бальніцы з амбулаторным і стацыянарным аддзяленнямі, стаматалагічным і фізіятэрапеўтычным кабінетамі, пяццю сацыяльнымі ложкамі сястрынскага догляду...

Адразу Ляскавічы прыраслі і жыхарамі. Землякі, якія некалі з'ехалі па розных прычынах, пачалі вяртацца на радзіму, аднаўляць крыху запушчанае бацькоўскае жыллё. Каб натхніць і падтрымаць тых, каго паклікалі карані, сельвыканкам нават аб'явіў конкурс на лепшы падворак сярод службовага і асабістага жылля. Матывацыяй стаў вылучаны Нацыянальным паркам 1 мільён рублёў пераможцам. Такім чынам удалося заахвоціць людзей яшчэ лепш падрыхтавацца да другога фестывалю.

***Наогул на тэрыторыі Ляскавіцкага сельсавета — два вялікія населеныя пункты. Самі Ляскавічы, дзе пражываюць 773 чалавекі, і Брынёў — там 460. Значна менш пражывае яшчэ ў шасці вёсках, а вось у адной, на жаль, не жыве ніхто. Увогуле колькасць насельніцтва складае 1465 чалавек.***



Старшыня Ляскавіцкага сельвыканкама Вольга ЯНКЕВІЧ.





## Глядзі, вучыся, гуляй

План мерапрыемстваў сёлетняга фестывалю зацвердзіў намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Міхаіл Русы. Згодна з гэтым планам, у заўтрашнім мерапрыемстве возьмуць удзел каля 1 тысячы артыстаў — самадзейных, заслужаных, аматарскіх, народных калектываў, індывідуальных выканаўцаў з васьмі рэгіёнаў Гомельскай вобласці, прафесійных калектываў з Беларусі, Расіі, Украіны. Ад нашай краіны выступяць Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай песні «Свята», арт-група «Беларусы», цыганскае шоу «Алюр». Запрошаны і замежныя прафесійныя калектывы Чарнігаўскай вобласці (Украіна) і Бранскай вобласці (Расія).

— У звязцы з фестывалем на Петрыкаўшчыне разгарнуўся этнаграфічны лагер «Летнік», у рабоце якога бяруць удзел фалькларысты і этнографы, а таксама студэнты Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна, — паведамляе **начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Вадзім ШЧЭРБІЧ.** — Падчас экспедыцыі ўдзельнікі сустракаліся з мясцовымі носьбітамі фальклору ў вёсках Галубіца, Конкавічы, Міхедавічы Петрыкаўскага раёна, знаёміліся з элементамі традыцый рэгіянальнай культуры. Сабраны матэрыял будзе абагульнены і выдадзены ў спецыяльным зборніку...

Сёння ўпраўленне культуры Гомельскага райвыканкама сумесна з Міністэрствам культуры і Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі правядуць міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Традыцыйная культура Палесся і сучасны свет». У ёй удзельнічаюць спецыялісты ў галіне традыцыйнай народнай культуры, этнографы, фалькларысты, гісторыкі-культуролагі, мастацтвазнаўцы Беларусі, Расіі і Польшчы. Вучоныя абмяркоўвалі актуальныя праблемы сучаснага Палесся і магчымасці захавання каштоўнай спадчыны.

Ужо з 15 жніўня на тэрыторыі Нацыянальнага парку працаваў пленэр майстроў драўлянай скульптуры «Драўляны цуд». Дзевяць майстроў з Гомельскай і Брэсцкай абласцей выраблялі драўляныя скульптуры з дубовага бярвення. Творы застануцца, безумоўна, на тэрыторыі парка.

Заўтра, 25 жніўня, гасцям фестывалю прадастаўляецца магчымасць азнаёміцца з тэматычнымі падворкамі народных промыслаў Палесся. Дванаццаць раёнаў прадставяць кожны сваю тэму. Скажам, Століншчына прадэманструе майстэрства ганчароў. Некалі ж тамтэйшыя ганчары забяспечвалі сваімі гаршчкамі ўсё Палессе! Пінчукі традыцыйна славіліся ўменнем шыць прыгожае адзенне, іх тэмай стане ткацтва. Для лельчукоў бліжэй бондарства і лазапляценне. Пяцёра кавалёў з Гродзенскай вобласці пакажуць сучаснікам сваё ўменне.

Падворкі размешчаны ўздоўж ракі, так што можна будзе паступова пераходзіць ад аднаго да другога, адкрываць для сябе свет нашых продкаў, а заадно ўбачыць выступленні творчых калектываў, іх абрадавыя танцы, гульні, усё тое, што адлюстроўвае каларыт палескага рэгіёна. Усё гэта будзе спалучацца з прэзентацыяй страў мясцовай кухні, работай пунктаў харчавання і гандлёвых радоў. Як і ў мінулы раз, будуць катанні на конях, у брычцы, цягнічку і г.д.

Для дзяцей устаноўлены пляцоўкі з атракцыёнамі, арганізавана гульнявая конкурсная праграма. Акрамя таго, будзе паказана незвычайная калекцыя адзення з прыродных матэрыялаў. Паралельна будзе дзейнічаць выстава дзіцячай творчасці.

Сваю творчую пляцоўку арганізуюць паэты, пісьменнікі і барды. Спецыяльная выстава прадэманструе кнігі аб жыцці беларускага Палесся. Мастакі Гомельшчыны атрымалі магчымасць паказаць больш за 50 сваіх работ. Ствараць новыя работы на пленэры будуць навучэнцы мастацкіх аддзяленняў дзіцячых школ мастацтваў Петрыкаўскага і Жыткавіцкага раёнаў.

Упраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму Гомельскага і Брэсцкага аблвыканкамаў сумесна з Нацыянальным агенцтвам па турызме правядуць сумесную выставу друкаванай рэкламнай прадукцыі для арганізацыі турыстычных маршрутаў. У сценах новага Музея прыроды пакажуць тэматычныя відэафільмы.

У межах свята адбудзецца шэраг конкурсаў, сярод якіх і «Ганаровы паляшук». Сваіх кандыдатаў прапанавалі для спаборніцтва 11 раёнаў.



## Экспанаты раскажуць усё

Удзельнікам і гасцям свята прадаставіцца магчымасць першымі азнаёміцца з новым музеем, які пачаў будавацца ў 2010 годзе на тэрыторыі Нацыянальнага парку, непасрэдна ў Ляскавічах. Парк наведвае штогод да 50 тысяч чалавек. Так што Музей прыроды можна назваць сёння звычайнай неабходнасцю. Аднак для таго, каб сам аб'ект аказаўся незвычайным, давялося сур'ёзна вывучаць вопыт і ўлічваць усе дробныя хібы пры стварэнні іншых падобных устаноў на тэрыторыі нашай і суседніх краін. Летась была здадзена першая чарга аб'екта — створана экспазіцыя залы прыродных комплексаў і аб'ектаў.

— У гэтай зале прадстаўлены асноўныя прыродныя комплексы — лясная і адкрытая поймы ракі Прыпяць, — праводзіць невялічкую экскурсію для звяздоўцаў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», кандыдат сельскагаспадарчых навук Анатоль УГЛЯНЕЦ.** — Адкрытая пойма — гэта месца пралёту і гнездавання вялікай колькасці птушак, так бы мовіць, міграцыйны калідор. Замежнікі з Галандыі, Аўстрыі, Бельгіі, іншых краін з задавальненнем прыязджаюць дзеля таго, каб пабачыць на пралёце чорнага бусла, арлана-белахваста, марадунку, белалазанку, турухтанаўку... Гэты ўчастак Нацыянальнага парку прадстаўлены на экспазіцыі ўвесну, калі Прыпяць шырока разліваецца... Менавіта тут, на астраўках сушы, захаваліся пойменныя дубравы. Такія ёсць, бадай, толькі на Прыпяці. Гэта ўнікальнае месца як для заходняй, так і для ўсходняй часткі Еўропы. Некаторыя замежнікі едуць да нас з мэтай азнаямлення з гэтымі дубравамі.

Наступная частка экспазіцыі — прыродны комплекс першай надпойменнай тэрасы. У Прыпяці — пойма і дзве тэрасы. Некалі рака была надта шырокай, аднак з цягам часу паток звузіўся, урэзаўся ўглыб і з'явіліся тэрасы. На першай мы бачым старычнае возера. Яно за тысячу гадоў утварылася на месцы былой ракі, якая змяніла сваё рэчышча. Тут таксама ёсць дубравы, шыракалістыя і чарнавольхавыя лясы, растуць вербы... Жывуць бабры, качкі, буслы, у іншых шыракалістых лясах добра сябе адчуваюць розныя віды парнакапытных. Найбольш каларытны тутэйшы прадстаўнік — еўрапейскі зубр. Яшчэ напрыканцы XVIII стагоддзя зубр быў на Прыпяці, аднак праз 200 гадоў давялося яго вяртаць на гэтыя ўгоддзі, завозіць з Белавежскай пушчы, падмаскоўнага запаведніка. Сёння тры вольныя мікрапапуляцыі зуброў жывуць тут свабодна, з камфортам. Мы іх толькі ахоўваем.



Трэцяя частка экспазіцыі — другая надпойменная тэраса. 6-8 тысяч гадоў таму гэта была велізарная лагуна, аднак пастувова зямля паднімалася, вады станавілася менш, з'яўляліся водныя астраўкі. Вятрамі намяло дзюны, мінеральныя астравы, якія акаляюць мясцовыя балоты — шырынёй да 10 км і даўжынёй — да 30 км. Гэта 30 тысяч га. Буйнейшае балота, прычым ёсць і нізіннае, і пераходнае, і верхавое. Верхавое — апошняе, адно з самых паўднёвых балот такога тыпу. На ўчастку шыракалістага лесу водзіцца алень, барсук, на ўскрайках сасновых лясоў — цецярук, а на балотах — пераважна глушэц, шэры журавель, які вядзе скрытны лад жыцця, жыве падалей ад людскіх вачэй. Гэта яшчэ адна сур'ёзная падстава для прыезду замежнага турыста — падзівіцца на гэтую пойму, гэтае балота. Праз наш тураддзел група турыстаў або адзін чалавек можа аформіць такую экскурсію... У нас, дарэчы, распрацаваны спецыяльныя экалагічныя тропы — да самай вялікай сасны ў парку, да цар-дуба, які толькі пяцёра абхапіць могуць... На цар-сасне яшчэ стаяць старыя калоды — борці, якія літаральна гадоў 50-70 таму давалі мёд. Засталіся яшчэ тыя, хто і цяпер займаецца бортніцтвам, збірае мёд на дрэвах. А такі мёд сапраўды каштоўны, чысты...

Далей надпойменная тэраса пераходзіць у водна-пясчаную раўніну з дзюнамі. З-за надта засушлівага клімату на Палессі елак, якія любяць вільгаць, фактычна няма, аднак тут, на пераходзе ад балота да сухадолу, захаваўся астраўны ельнік. З жывёл у гэтых мясцінах сустракаюцца воўк, кабан, казуля і іншыя.



Нарэшце, дзюны, пяскі. Гадоў 10 тысяч таму вятры надзьмулі дзюны. Тут растуць крываватыя нізкарослыя сосны — не ўзнімаюцца вышэй, бо ім не хапае вільгаці. Крыху ніжэй сустракаецца сасна больш прамая і высокая, больш дрэў і кустоў, ёсць верасовыя, чарнічнік. Цячэ адна з невялікіх палескіх рачулак — Свінавод. Верагодна, назвалі яе так з-за таго, што некалі тут вадзіліся дзікія свінні. Бліжэй да рэчкі прытулілася вёска. З жывёл мы бачым казулю еўрапейскую, лісу...

Падчас экскурсіі наведвальнік даведаецца, што працягласць Прыпяці, якая працякае праз Брэсцкую і Гомельскую вобласці і ўпадае ў Кіеўскае вадасховішча, складае 761 км. У рацэ сустракаюцца 44 віды рыб, некаторыя з іх — сом, судак, шчупак, сазан (або дзікі карп), лінь, лешч, акунь і плотка — прадстаўлены ў якасці музейных экспанатаў давволі арыгінальным чынам... Калі паглядзець уверх, можна ўбачыць чучалы ястраба, савы, луня балотнага і палявога, сокала-пустэльгі і інш.

На першым паверсе музея прадстаўлена таксама гісторыя і археалогія прыпяцкага Палесся. Наведвальнік павінен атрымаць інфармацыю аб тым, што тут было ў час, калі толькі пасяліўся чалавек, і што ўяўляе Нацыянальны парк «Прыпяцкі» сёння. На другім паверсе — экспазіцыя быту і заняткаў палешукоў. Можна пабачыць падворак палешука, а надалей будуць дзейнічаць зменныя выставы рэчаў, карцін і фота. Мяркуецца, што першым выставіцца гомельскі калекцыянер Валерый Грымашэвіч, які мае шмат старых абрусаў, ручнікоў мінулых стагоддзяў, нацельныя крыжыкі, каменныя сякеры, нават кавалачкі паперы з указам цара, стары пашпарт і інш. Такім чынам, музей дасць усе асноўныя веды аб жыцці Палесся.

***Флора Нацыянальнага парку — гэта 1073 віды вышэйшых раслін, 48 з якіх занесены ў Чырвоную кнігу; ёсць 24 віды папараці, 243 віды лішайнікаў, 199 відаў моху, 500 відаў водарасцяў і да 1 тысячы відаў грыбоў. Жывёльны свет — гэта 350 відаў млекакормячых. Рэгіструецца 258 відаў птушак, з іх 195 гняздуюцца, астатнія бываюць на пралёце. Ёсць 7 рэптылій, 13 амфібій.***

## Каб было што перадаць...

Сведкамі першага фестывалю сталі каля 10 тысяч чалавек. Сёлета арганізатары гатовы прыняць і больш. Сустракаць гасцей і ўдзельнікаў будуць гасцініцы саміх Ляскавічаў, Петрыкава і Жыткавічаў. Спецыяльна да свята былі падрыхтаваны і забяспечаны ўсім неабходным восем купэйных вагонаў на чыгунцы, некаторыя навучальныя ўстановы Ляскавічаў.

— Сёння ёсць і дзе спыніцца, і што паесці. Іншая справа — людзям трэба паказваць нешта цікавае, адметнае, самабытнае, бо гэта зближае і натхняе, — кажа **генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан БАМБІЗА.** — Палессе, яно, вядома, распаўсюджваецца на чатыры краіны — Расію, Украіну, Беларусь і Польшчу. У Польшчы, напрыклад, падобныя фестывалі праводзяцца на вельмі высокім узроўні. І нам трэба не адставаць. З аднаго боку, падчас такіх сустрэч аб'ядноўваюцца беларусы, расіяне, украінцы і палякі, а з другога — нашы вяскоўцы, іх сем'і. Малыя і старыя апранаюць уборы, якія захаваліся ў іх ад прабабуль, выходзяць разам на сцэну, выступаюць...



Генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан БАМБІЗА.

З іншага боку, нам неабходна захаваць і перадаць наступным пакаленням шэраг уменняў. Каб нашы нашчадкі ведалі, што менавіта тут было здабыта жалеза, што тут былі выдатныя кавалі, бортнікі і г.д. Сёння ж нашы дзеці, бадай, не ўяўляюць, як плятуцца лапці, робяцца снасці... Як захаваць этнакультурную спадчыну? Толькі з дапамогай падобных свят. Зацікавіць, а потым вучыць. На гэтую ідэю павінен працаваць і наш новы музей.

Музей прыроды — неабходная атрыбутыка Нацыянальнага парку. Гэта вельмі эфектыўнае экалагічнае выхаванне як дзяцей, так і дарослых. Так, у нас была палеміка адносна таго, будаваць падобную ўстанову ці абысціся без яе. Для мяне асабіста адказ на гэтае пытанне быў адназначны: трэба паказваць, чым можна ганарыцца. Фінансаванне часткова забяспечыў Фонд аховы прыроды, астатняе парк узяў на сябе. Сам новы будынак — гэта аснова музея. Аднак пляцоўка вакол яго павінна стаць у перспектыве музеем пад адкрытым небам — каб там былі, скажам, млын, сядзіба палешука, а можа, і не толькі палешука, але і нашых суседзяў... Ідэй мноства. Трэба іх толькі ўкараняць і развіваць...

**Святлана БАРЫСЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

*УНП 400050258*



Намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», кандыдат сельскагаспадарчых навук Анатоль УГЛЯНЕЦ у Музеі прыроды.





Мастакі Мікалай КУПРЫЧ і Віктар КАЎШЫРКА ствараюць у новым музеі дыяраму стаянкі старажытнага чалавека на Прыпяці.